Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

21 ЛІСТАПАДА 2023 г. АЎТОРАК № 225 (30105)

КАЛІ СЛУЖБА — СПРАВА СЯМЕЙНАЯ 5

КУПАЛАЎСКІЯ ЧЫТАННІ Ў КУПАЛАЎСКІМ УНІВЕРСІТЭЦЕ 12

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падпісаў 20 лістапада ўказы нумар 367 «Аб назначэнні выбараў дэпутатаў» і нумар 368 «Аб назначэнні выбараў у Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь».

Гэтымі дакументамі ў адпаведнасці з патрабаваннямі Канстытуцыі прадугледжваецца правядзенне выбараў у Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу восьмага склікання і мясцовыя Саветы дэпутатаў дваццаць дзявятага склікання ў адзіны дзень галасавання — 25 лютага 2024 года, а ў Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу восьмага склікання — 4 красавіка 2024 года.

Вылучэнне кандыдатаў у члены Савета Рэспублікі мясцовымі Саветамі дэпутатаў, выканаўчымі і распарадчымі органамі павінна адбыцца не пазней за 21 сакавіка 2024 года.

Адначасова Цэнтрвыбаркаму, дзяржаўным органам, іншым арганізацыям даручаецца прыняць меры па арганізацыі выбараў, а ўраду — забяспечыць фінансаванне расходаў на іх падрыхтоўку і правядзенне за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту.

ЦЫТАТА ДНЯ

Андрэй КАРТУН, намеснік міністра эканомікі:

«Фізічныя аб'ёмы экспарту тавараў у студзені — верасні выраслі больш як на чвэрць. Коштавыя аб'ёмы паставак максімальныя за апошнія 11 гадоў. За верасень экспарт тавараў і паслуг дасягнуў $4,2 млрд, а сумарнае дадатнае сальда — рэкордных у бягучым годзе $370 млн. Эфектыўная работа эканомікі забяспечыла высокі ўзровень зарплаты — 1940 рублёў у верасні. Таксама з 1 верасня 2023 года на 5 працэнтаў выраслі працоўныя пенсіі. Росту даходаў насельніцтва ў рэальным выражэнні садзейнічае нізкі ўзровень індэкса спажывецкіх цэн: 3,7 працэнта ў гадавым выражэнні. Паводле нашых ацэнак, да канца года інфляцыя складзе каля 5,5 %».

На патрыятычнай будоўлі

Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

На мінулым тыдні на Усебеларускай маладзёжнай будоўлі — узвядзенні Рэспубліканскага цэнтра патрыятычнага выхавання моладзі на базе Кобрынскага ўмацавання Брэсцкай крэпасці — прыступіў да работы першы студатрад з Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта. Маладыя рупліўцы працуюць, вядома, не адны: вопытныя будаўнікі заўсёды падкажуць і сарыентуюць. І нават вызначаць аб'ём работ, што, уласна, і робяць на фота работнікі «Брэстжылбуду» інжынер Іван ЖЫЛІЧ і брыгадзір муляраў Павел ВЕРАМЯЮК.

Жывая тэма

МЯДЗВЕДЗЬ — НЕ ПЛЮШАВАЯ ЦАЦКА

Як бяспечна існаваць побач з адным з найбуйнейшых драпежнікаў на планеце

Калі яшчэ некалькі гадоў назад сустрэча з мядзведзем у нашай краіне была вялікай рэдкасцю, дык сёння гэта вельмі нават верагодна. У сеціве людзі выкладваюць відэа, на якіх мішка бяжыць уздоўж ажыўленай трасы, ласуецца яблыкамі ў садзе, варочае вуллі ў пчальніку, стаіць на шляху машыны на лясной дарозе... Сёлета мядзведжая сям'я купалася ў ручаіне зусім побач са сталіцай, каля Ждановічаў...

Усё гэта, канешне, міла і весела, але ж мы маем справу з адным з самых буйных у свеце драпежнікаў. І ў адзін момант мімімішка можа ператварыцца ў раз'юшанага звера, для якога чалавек — здабыча і ежа. Але ж мядзведзь — «чырванакніжнік», ахоўваецца дзяржавай, паляванне на яго забаронена. Як вытрымаць гэты баланс у такіх умовах — захаваць папуляцыю рэдкага прыгожага звера без урону для жыцця людзей? Пра гэта ў размове з журналістамі нядаўна разважаў старшыня Беларускага таварыства паляўнічых і рыбаловаў Ігар Шуневіч пасля даклада ў Прэзідэнта. Дарэчы, на гэтай сустрэчы Аляксандр Лукашэнка пытанне рэгулявання колькасці звяроў і птушак, занесеных у Чырвоную кнігу, назваў супердзяржаўным. СТАР. 9

Па палічках

СЛУХАЦЬ РЫЭЛТАРА І НЕ ПАДМАНУЦЦА

Што трэба ведаць, набываючы кватэру, каб не заплаціць лішку

Пастанова Саўміна «Аб тарыфах на рыэлтарскія паслугі», якая ўступіла ў сілу 4 лістапада 2023 года, унесла змены ў правілы работы прафесійных удзельнікаў рынку нерухомасці — рыэлтарскіх агенцтваў, якія валодаюць ліцэнзіямі на аказанне рыэлтарскіх паслуг. Новаўвядзенні закранулі розныя аспекты дзейнасці рыэлтарскіх агенцтваў. У прыватнасці, пазбавілі нядобрасумленныя арганізацыі магчымасці трактаваць заканадаўства па-свойму; абавязалі прадстаўляць варыянты здымнага жылля, а не толькі яго адрасы; вызначылі гранічныя межы рыэлтарскіх тарыфаў.

Спецыялісты расказалі пра новаўвядзенні і развянчалі найбольш распаўсюджаныя міфы, створаныя несумленнымі рыэлтарамі, якія апошнія з разумным выглядам выдаюць за існасць, а на справе пераследуюць толькі адну мэту — завалодаць вашымі грашыма, і пры гэтым яшчэ і парушаюць закон. СТАР. 7

ISSN 1990 — 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

У НОВЫ ГОД – СА СТАРЫМ СЯБРАМ!

Ідзе падпіска на І паўгоддзе 2024 года.

Усім, хто падпісаўся на І квартал або І паўгоддзе 2024 года, у падарунак чатыры календары: насценны, рэлігійны, народны і месяцавы.

«ТРЭБА ГОДНА ПРАВЕСЦІ СЕСІЮ НАШАЙ ВАЕННА-ПАЛІТЫЧНАЙ АРГАНІЗАЦЫІ»

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

Прэзідэнт сустрэўся з Генеральным сакратаром АДКБ Імангалі Тасмагамбетавым

Галоўнай тэмай размовы стала падрыхтоўка сесіі Савета калектыўнай бяспекі АДКБ, якая адбудзецца ў Мінску. Саміт запланаваны на 23 лістапада. Акрамя таго, Старшыні Савета калектыўнай бяспекі АДКБ Аляксандру Лукашэнку была прадстаўлена падрабязная справаздача аб выкананні плана мерапрыемстваў паводле рашэнняў Савета калектыўнай бяспекі лістападаўскай сесіі 2022 года. Асобную ўвагу падчас сустрэчы ўдзялілі выкананню прыярытэтных кірункаў Рэспублікі Беларусь у перыяд старшынства ў АДКБ.

«У нас з вамі адказны перыяд: нам трэба годна правесці сесію нашай ваенна-палітычнай арганізацыі, — задаў тон размовы кіраўнік дзяржавы. — Я б хацеў перш за ўсё ад вас пачуць, калі гэта ёсць, пэўныя нюансы напярэдадні гэтага мерапрыемства — вельмі адказнага мерапрыемства».

Прэзідэнт заўважыў, што беларускі бок вельмі сур'ёзна рыхтуецца да будучага саміту. «Спадзяюся, што дадзенае мерапрыемства ў рамках ваенна-палітычнай арганізацыі ў Мінску будзе садзейнічаць нарошчванню нашых намаганняў па абароне і бяспецы членаў АДКБ», — канстатаваў ён.

Кажучы ў цэлым аб дзейнасці Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы, Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што дзяржавы — удзельніцы АДКБ перажываюць няпросты перыяд у постсавецкай прасторы. «Перш за ўсё гэты перыяд характарызуецца некаторымі канфліктнымі сітуацыямі на гэтай жа постсавецкай прасторы, і ў тым ліку ў зоне адказнасці Дагавора калектыўнай бяспекі, — удакладніў беларускі лідар. — Я заўсёды падкрэсліваў: добра, што ў гэты момант на поўдні ў Цэнтральнай Азіі мы знайшлі развязкі некаторага канфлікту паміж Таджыкістанам і Кыргызстанам».

Скончылася і супрацьстаянне паміж Арменіяй і Азербайджанам. «Трэба думаць аб будучыні: як уладкоўваць там жыццё дзвюх дзяржаў, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Зразумела, што і там, і там праблемы назапашваліся не адзін год, не два, не тры і не пяць. Гэта даўняя болевыя кропкі, але намеціўся пазітыў у гэтых адносінах».

Прэзідэнт звярнуў увагу на тое, што пазітыўныя змяненні адбыліся не таму, што Беларусь у гэты міжсесійны перыяд старшынствавала ў АДКБ. «Але на гэты перыяд прыйшоўся такі момант руху, трэнд да супакаення сітуацыі на постсавецкай прасторы, — дадаў беларускі лідар. — Яшчэ раз падкрэсліваю, у зоне адказнасці АДКБ, бо і Арменія, і Кыргызстан з'яўляюцца членамі АДКБ».

У сваю чаргу Генеральны сакратар АДКБ Імангалі Тасмагамбетаў выказаў удзячнасць Прэзідэнту Беларусі за магчымасць абмеркаваць як праблемныя пытанні, так і бягучы працэс работы, звязаны з правядзеннем вельмі важных мерапрыемстваў. Сярод іх — і сумесныя пасяджэнні Савета міністраў абароны, Савета міністраў замежных спраў, сакратароў Саветаў бяспекі і, натуральна, вялікі Савет калектыўнай бяспекі.

Генсек АДКБ расказаў беларускаму лідару аб выкананні плана мерапрыемстваў па рэалізацыі рашэнняў Савета калектыўнай бяспекі лістападаўскай сесіі мінулага года і прыярытэтных кірунках Рэспублікі Беларусь у перыяд старшынства. «Павінен сказаць, што з 34 мерапрыемстваў 32 выкананы, — канкрэтызаваў ён. — Два мерапрыемствы, на жаль, выканаць не змаглі. Гэта перш за ўсё нашы міжнародныя кантакты з еўрапейскімі міжнароднымі арганізацыямі, такімі як АБСЕ. У сілу іх пазіцый. І другое пытанне — даручэнне Савета калектыўнай бяспекі па дапрацоўцы рашэння аб дапамозе Арменіі. Армянскі бок, хаця ўсе астатнія саюзнікі падтрымалі гэтае рашэнне, не выказаў ніякай зацікаўленасці гэтым дакументам і, больш за тое, у завяршальнай частцы нашай работы папрасіў зняць яго з парадку дня».

Як паведамлялася раней, прэм'ер-міністр Арменіі Нікол Пашынян адмовіўся прыехаць на сесію Савета калектыўнай бяспекі АДКБ у Мінск.

Вераніка КАНЮТА.

«АСНОЎНЫХ ДЫПЛАМАТАЎ МЫ ПАВІННЫ ПЕРАКІНУЦЬ НА ТЫЯ НАПРАМКІ, ДЗЕ МЫ БАЧЫМ РУХ»

Падрабязнасці дыпламатычнага кадравага дня

У новы тыдзень — з новай пасадай. Вынікі гэтага кадравага дня ў Палацы Незалежнасці хутка пабачаць у розных частках свету. Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка прызначыў новых надзвычайных і паўнамоцных паслоў.

Аляксандр Чарвякоў змяніў партфель міністра эканомікі на дыпламатычны статус Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла Рэспублікі Беларусь у Кітайскай Народнай Рэспубліцы. Ігар Маршалаў, намеснік старшыні Камітэта дзяржаўнага кантролю — дырэктар Дэпартамента фінансавых расследаванняў, прызначаны Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом у Зімбабвэ.

Гэтых паслоў Аляксандр Лукашэнка запрасіў асобна. Ён растлумачыў, што Кітай і Зімбабвэ — краіны надзвычай важныя. Прэзідэнт адзначыў, што з КНР выбудаваны адносіны па асноўных напрамках, кантакты вызначаны. Але з Зімбабвэ Беларусь будуе адносіны не «з белага ліста», заўважыў Прэзідэнт, згадаўшы свой нядаўні візіт у гэту краіну. «Хаця хлеба ўжо дзякуючы нам атрымалі дастаткова, каб людзей накарміць, але работы вельмі шмат», — сказаў беларускі лідар. Па яго словах, у Зімбабвэ трэба стварацьдыпламатычнае прадстаўніцтва, шырэй уваходзіць у гэтую краіну. «Тым больш яны нас чакаюць вельмі. Нас шануюць, мы даказалі, што мы самавітыя людзі. І яны жадаюць, каб мы свае тэхналогіі і ў машынабудаванні, і іншых галінах — будаўніцтве, ахове здароўя, адукацыі (падрыхтоўка кадраў вельмі важная), ды і ў аграрным сектары — пераносілі ў Зімбабвэ», — сказаў кіраўнік дзяржавы. Ён дадаў, што не варта забываць і пра супрацоўніцтва з суседнім Мазамбікам, які таксама зацікаўлены ў наладжванні сувязяў з Беларуссю.

Вяртаючыся да тэмы супрацоўніцтва з Кітаем, Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што гэта краіна разам з Расіяй уваходзіць у лік асноўных партнёраў. Кітай дапамагае Беларусі і тэхналагічна, і ў фінансавых адносінах. Кіраўнік дзяржавы разлічвае, што вопыт Аляксандра Чарвякова дасць магчымасць узняць адносіны з Кітаем на больш высокі ўзровень.

«Таму работы будзе дастаткова», — падсумаваў Аляксандр Лукашэнка.

У Афрыцы і на Далёкім Усходзе трэба замацоўвацца

Начальнік галоўнага ўпраўлення Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі Міністэрства замежных спраў Ігар Белы прызначаны паслом Беларусі ў Паўднёва-Афрыканскай Рэспубліцы і па сумяшчальніцтве ў Рэспубліцы Батсвана, Рэспубліцы Мазамбік і Рэспубліцы Намібія. Сяргей Маліноўскі, начальнік галоўнага інфармацыйна-аналітычнага ўпраўлення МЗС, — новы пасол Беларусі ў Рэспубліцы Сербіі і па сумяшчальніцтве ў Рэспубліцы Паўночная Македонія. Раман Раманоўскі, намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення — начальнік упраўлення агульнаеўрапейскага супрацоўніцтва галоўнага ўпраўлення Еўропы і Паўночнай Амерыкі МЗС, таксама прызначаны паслом. Ён будзе прадстаўляць інтарэсы Беларусі ў Інданезіі і па сумяшчальнітве ў Малайзіі, Сінгапуры і Філіпінах. Кіраўнік дзяржавы ўзгадніў кандыдатуру Аляксандра Мацукова, начальніка ўпраўлення па пытаннях грамадзянства і выезду за мяжу галоўнага консульскага ўпраўлення МЗС, на пасаду Генеральнага консула Рэспублікі Беларусь у індыйскім горадзе Мумбаі.

Прэзідэнт пацікавіўся, чым так вызначыліся гэтыя людзі, што менавіта іх кандыдатуры абралі сярод кагорты іншых прэтэндэнтаў. Міністр замежных спраў Сяргей Алейнік адказаў, што ўсе прадстаўленыя супрацоўнікі маюць дыпламатычны досвед працы, які складае больш за 20 гадоў. «Усе супрацоўнікі валодаюць неабходнымі ведамі, навыкамі і маюць досвед працы ў замежных установах, зарэкамендавалі сябе на цяперашніх пасадах у якасці кампетэнтных спецыялістаў, патрыятычна настроены. Я ўпэўнены, што яны будуць годна прадстаўляць нашу рэспубліку і будуць адстойваць нашы інтарэсы ў гэтых краінах, прасуюючы ў першую чаргу эканамічны парадак дня, які сёння для нас з'яўляецца прыярытэтам», — сказаў ён.

Кіраўнік дзяржавы адзначыў вялікія магчымасці супрацоўніцтва Беларусі з краінамі Афрыканскага кантынента. Па яго словах, супрацоўніцтва з Мазамбікам павінна будавацца паралельна з супрацоўніцтвам з суседнім Зімбабвэ. «Яны вельмі зацікаўлены ў нас, і мы свае тэхналогіямі, асабліва ў аграрна-прамысловым комплексе, можам выдатна ім дапамагчы. Праблем там вельмі шмат. У Зімбабвэ сёння вельмі рады, што нарэшце накармілі хлебам людзей. Убраць хлеб не маглі, а цяпер убіраюць. Два-тры ўраджаі — і яны забяспечылі сябе галоўным прадуктам. Ну, чаму мы Мазамбіку не можам дапамагчы? Можам. Таму трэба разабрацца ў сітуацыі і галоўны акцэнт рабіць на той краіне, дзе мы вельмі патрэбны і дзе мы можам ім дапамагчы. Ну натуральна, гэта не дабрачыннасць. Зірніце на гэта», — параіў Прэзідэнт новаму паслу.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што перспектывы супрацоўніцтва з Сербіяй трэба сур'ёзна вывучыць і найперш — як гэта краіна ставіцца да нашай. «Трэба разабрацца ў той палітыцы, якую Сербія праводзіць і жадае праводзіць у адносінах да Беларусі. Калі яны хочуць, значыць, павінен быць вынік у гандлёва-эканамічных адносінах. Калі яны хочуць «віляць хвастом», груба кажучы, і падтрымліваць еўрапейска-амерыканскія санкцыі супраць Беларусі, гэта іх справа, няхай вызначаюцца і падтрымліваюць, калі яны забыліся пра тое дабро, з якім мы ішлі да іх», — сказаў ён. Беларускі лідар настойвае, што трэба ісці да тых краін, якія самі настроены на партнёрскі і канструктыўны дыялог. «Мы выходзім на яшчэ адну праблему, пра якую я казаў. Калі Захад і Амерыка не жадаюць з намі супрацоўнічаць, то добра, будзем «пільнаваць» свае пасольствы, дзе гэта трэба. А асноўных дыпламатаў мы павінны перакінуць на тыя напрамкі, дзе мы бачым рух», — сказаў ён.

Кажучы пра супрацоўніцтва з краінамі Паўднёвага Усходу, Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што беларусы там не вельмі замацаваліся. Супрацоўніцтва з гэтымі краінамі характарызуецца, па яго словах, некалькімі эпізадычнымі гандлёва-эканамічнымі кантактамі. «Трэба замацоўвацца. Інданезія, Малайзія, ды і Сінгапур гэта цікавыя для нас краіны, і ўсюды мы павінны паўтара-два праекты знайсці. Гэта найважнейшая задача», — заявіў Прэзідэнт.

Па яго словах, генеральнае консульства ў індыйскім Мумбаі павінна працаваць разам з пасольствам. «У Дэлі трэба аб'ядноўвацца, гэта адназначна. Аб'ядноўвацца, не дзяліць там пасольствы, консульскія падраздзяленні. Калі трэба ўзмацняць, значыць, трэба ўзмацняць, — сказаў ён. — Мы павінны наладзіць больш цеснае супрацоўніцтва з Індыяй, якое будзе выяўляцца найперш у гандлёва-эканамічных адносінах. Глабальная краіна, велізарная, мы павінны бачыць там сваю цікавасць».

Валерыя СЦЯЦКО.

❍ У тэму

АСНОЎНАЯ ЗАДАЧА — ІНТЭНСІЎНЫ ДЫЯЛОГ, У ЦЭНТРЫ ЯКОГА ЭКАНАМІЧНАЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА

«Кітай для нас — адзін з галоўных стратэгічных партнёраў. Літаральна за дзесяцігоддзе наш тавараабарот узрос практычна ў 1,7 раза. У мінулым годзе гэты паказчык дасягнуў 5,7 мільярда долараў. У гэтым годзе па экспарце ў нас каля 1,4 мільярда пры тым, што за ўвесь мінулы год нашы пастаўкі складалі 1,6 мільярда. Мы бачым, як актыўна пачынаюць працаваць з кітайскім рынкам нашы прадпрыемствы, хоць ёсць і пэўныя цяжкасці — гэта і адлегласць, і моўны бар'ер», — падкрэсліў Аляксандр Чарвякоў у размове з журналістамі. Ён расказаў, што кіраўнік дзяржавы паставіў задачы па зняцці бар'ераў і павелічэнні беларуска-кітайскага тавараабароту. Гэта першы блок задач для новага пасла. Усяго іх тры — гандлёва-эканамічны, палітычны і гуманітарны. «Па гэтых трох блоках пастаўлены пэўныя задачы. Але стрыжнем з'яўляецца эканоміка. У першую чаргу намаганні будуць накіраваны на тое, каб нашы эканамічныя сувязі пашыраліся і паглыбляліся. На наступны год нашай мэтай з'яўляецца дасягненне 2,5 мільярда экспарту. І на дасягненне мэты мы будзем працаваць. А для гэтага неабходна выбудаваць правільную лагістыку, зняць бар'еры на шляху, забяспечыць каналы паставак і фінансавання. Гэтыя пытанні павінны разглядацца ў комплексе, і па кожным з кірункаў павінны быць прыняты меры, якія забяспечаць бесперашкодны рух тавараў і грошай», — сказаў Аляксандр Чарвякоў.

Задачы, звязаныя з павелічэннем тавараабароту, стаяць і перад паслом Беларусі ў Зімбабвэ Ігарам Маршалавым. «Ёсць шмат дзейных кантрактаў. Ёсць таксама кантракты і на наступны год. Задача стаіць па ўдзеле Беларусі ў механізацыі гэтай краіны. Ужо сёлета там быў атрыманы добры ўраджай, у тым ліку дзякуючы беларускай тэхніцы. Ёсць задачы па абслугоўванні гэтай краіны тэхнікай, навучанні персаналу. Будзем над гэтым працаваць», — падкрэсліў дыпламат.

Літаральна некалькі дзён таму, падчас наведвання завода «Крышталь» у Гомелі, Прэзідэнт заўважыў, што краіны Афрыкі цікавыя Беларусі і сваёй алмазнай сыравінай. Работа ў гэтым кірунку таксама — адказнасць пасла ў Зімбабвэ. «Нетры краін Афрыкі вельмі багатыя, і многія дзяржавы свету імкнуцца гандляваць з імі. Беларусь мае пэўныя кампетэнцыі, якія нам будзе цікава рэалізаваць у тым ліку і ў Зімбабвэ», — сказаў Ігар Маршалаў.

«Што да ПАР, то мы не будзем абмяжоўвацца толькі пастаўкамі нашай прадукцыі. Мы будзем працаваць над вытворчай кааперацыяй — зборкай нашай сельскагаспадарчай тэхнікі ў першую чаргу. Поўдзень Афрыкі вельмі багаты на карысныя выкапні, а ў нас ёсць вельмі добрыя кампетэнцыі і ў кар'ернай тэхніцы, і ў горнай здабычы. Гэты кірунак таксама не застаецца за кадрам», — расказаў Ігар Белы, які прызначаны паслом Беларусі ў Паўднёва-Афрыканскую Рэспубліку. Ён нагадаў, што ПАР — член БРІКС. А Беларусь падала заяўку на ўступленне ў гэту арганізацыю. Таму палітычная частка работы пасла таксама будзе насычанай. «Будзем расоўваць гэтую тэму. Калі мы паглядзім на эканоміку, то ПАР — практычна самая развітая краіна Афрыкі, таму перспектывы ёсць», — адзначыў Ігар Белы. Ён таксама па сумяшчальніцтве будзе акрэдытаваны ў якасці пасла Беларусі ў Батсване, Мазамбіку і Намібіі. «Лагістыка цяпер — гэта ахілесава пята нашага знешняга гандлю. Таму будзем вырашаць і лагістычныя пытанні. Эканоміка Мазамбіка падобная да эканомікі Зімбабвэ. У Зімбабвэ ў нас вельмі добрыя вынікі, таму маёй задачай будзе перанесці вопыт нашай работы ў Зімбабвэ на Мазамбік і дабіцца такіх жа вынікаў», — сказаў дыпламат. Ён звярнуў увагу, што на афрыканскім рынку цяпер прысутнічаюць не толькі еўрапейцы. «Практычна ўвесь свет усведамляе, што за Афрыкай будучыня і без Афрыкі мы не зможам забяспечыць наш эканамічны рост. Таму канкурэнцыя там вельмі жорсткая, асабліва ў ПАР. Але я думаю, што наша якасная прадукцыя зможа выйграць гэту канкурэнцыю», — адзначыў Ігар Белы.

Сяргей Маліноўскі, прызначаны паслом у Сербію, падкрэсліў, што гэта краіна з'яўляецца гістарычна блізкім партнёрам для Беларусі. Але, як адзначыў кіраўнік дзяржавы, не ўсё ў нашых адносінах на сёння развіваецца так, як хацелася б. «Таму адна з маіх асноўных задач — гэта інтэнсіўны дыялог па палітычнай лініі, удакладненне пазіцый. Вядома ж, Беларусь заўсёды падтрымлівала і падтрымлівае Сербію ў прынцыпова важных для яе пытаннях. Беларускі бок гэтак жа чакаў бы і разлічваў на аналагічны падыход сербскага боку», — сказаў дыпламат. Паводле яго слоў, сітуацыя ў еўрапейскім рэгіёне і санкцыйная палітыка Захаду не могуць не ўплываць на беларуска-сербскія адносіны. «У гэтым ракурсе неабходна будзе больш дакладна разабрацца і зразумець, дзе асноўныя праблемы, і шукаць шляхі, па якіх мы можам актывізаваць і нарасціць нашы адносіны і ў палітычнай, і ў гандлёва-эканамічнай плоскасці», — адзначыў ён.

За руплівасць і хлеб

У Віцебску адбыліся заключны этап абласнога фестывалю-кірмашу працаўнікоў вёскі «Дажынкі» і ўрачыстае мерапрыемства, прысвечанае Дню работнікаў сельскай гаспадаркі і перапрацоўчай прамысловасці АПК. Заслужанымі ўзнагародамі адзначана каля 100 найлепшых аграрыяў паўночнага рэгіёна.

Фота БелТА.

У мінулую суботу канцэртная зала «Віцебск» ператварылася ў вялікую святочную пляцоўку, дзе словы падзякі за працу і адданасць нялёгкай аграрнай галіне гучалі ў гонар перадавікоў сельскагаспадарчай вытворчасці. Першыя ўзнагароды працаўнікі атрымалі на малой сцэне канцэртнай залы «Віцебск», больш за сорак чалавек былі адзначаны ганаровымі граматамі аблвыканкама, абласнога Савета дэпутатаў, Віцебскага канцэрна «Мяса-малочныя прадукты», пуцёўкамі ў санаторыі ад рэспубліканскага і абласнога камітэтаў прафсаюза работнікаў АПК. Упершыню на абласных «Дажынках» ушаноўвалі тых, хто разам з аграрыямі з раніцы і да позняга вечара дапамагалі ўбіраць хлеб: кіроўцу раённага аддзела па надзвычайных сітуацыях, аператара кацельні, кіроўцу электрасетак і іншых. Першы намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама Анатоль Ліневіч адзначыў, што кожны год суправаджаецца пэўнымі цяжкасцямі і цяперашні — не выключэнне. Тым не менш Віцебшчына ўнесла дастойны ўклад у агульны вал збожжа па краіне.

Старшыня Палаты прадстаўнікоў Уладзімір Андрэйчанка дадаў, што дасягнутых вынікаў не адбылося б, калі б не было пастаяннай увагі і падтрымкі з боку кіраўніка дзяржавы. Спікер ніжняй палаты парламента зачытаў прывітальны адрас Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і перадаў старшыні аблвыканкама кампазіцыю з кветак ад кіраўніка дзяржавы.

«Больш за 800 тысяч тон збожжа — у нашых засеках. Думаю, сёлета гэта вельмі нядрэнны вынік», — пагадзіўся **старшыня Віцебскага аблвыканкама Аляксандр СУБОЦІН** і дадаў, што ўпершыню на абласных «Дажынках» словы падзякі гучаць у адрас работнікаў іншых арганізацый. «Мы ўшаноўваем і тых, хто кругласутачна, нягледзячы на надвор'е і пару года, працуе, каб у нас на стале быў дастатак. Гэта і жывёлаводы, і ветэрынарныя ўрачы, і механізатары, і інжынеры, і тыя хлопцы, якія проста дапамагаюць, каб аграпрамысловы комплекс дынамічна працаваў і развіваўся. Гэта і банкіры, і сацыяльныя работнікі, і гэтак далей. Ім усім мы сёння гаворым «дзякуй».

Узнагароды рэспубліканскага і абласнога ўзроўняў атрымалі найлепшыя трактарысты-машыністы, камбайнеры, кіроўцы, аператары зернесушыльных комплексаў, кіраўнікі прадпрыемстваў сферы, а таксама найлепшыя рэгіёны.

У Віцебскай вобласці сёлета на ўборцы ўраджаю працавалі больш за тысячу збожжаўборачных экіпажаў. Тысячны намалот перасягнулі 212 экіпажаў камбайнераў, двухтысячны — 22 экіпажы. Адзін экіпаж рэкорд цяперашняй уборачнай — звыш 4 тысяч тон — устанавілі Максім Сярноў з агракамбіната «Юбілейны» Аршанскага раёна і Аляксандр Зябко з закрытага акцыянернага таварыства «Віцебскагрупрадукт». Максім Сярноў у ліку пераможцаў жніва з 2017 года, пачынаў у складзе маладзёжных экіпажаў. Другі год запар сярод пераможцаў Аляксандр Зябко, у гэтым годзе ён заняў другое месца. Сярод маладзёжных экіпажаў найлепшы вынік у 2 тысячы 653 тоны паказаў Ілья Лазарэнка з агракамбіната «Юбілейны» Аршанскага раёна. Дарэчы, для агракамбіната гэты год знакавы, бо ў лік пераможцаў абласных «Дажынак» увайшлі чатыры яго экіпажы камбайнераў.

Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.

ПЛЁН АГРАРЫЯЎ ГОМЕЛЬШЧЫНЫ

У сёлетні сезон кожны чацвёрты экіпаж у рэгіёне стаў «тысячнікам»

Удзельнікі абласнога фестывалю працаўнікоў вёскі «Дажынкі-2023» у Гарадскім пасёлку Акцябрскі падвялі вынікі сельскагаспадарчага года.

Фота БелТА.

Па традыцыі адным з галоўных атрыбутаў свята стала выстаўка тэхнікі. Размясціліся на ёй і апошнія мадэлі, і рарытэты. Можна ўбачыць і падарункі гаспадаркам да «Дажынак». Удзельнікаў свята ў Акцябрскім віталі адмысловыя падворкі, выставы прадукцыі прадпрыемстваў рэгіёна, гульнявыя пляцоўкі і інтэрактыўныя зоны для сямейнага адпачынку.

Ролю галоўнай святочнай пляцоўкі ўзяў на сябе абноўлены цэнтр вольнага часу Акцябрскага. Тут стартаваў першы блок урачыстага ўзнагароджання працаўнікоў сельскай гаспадаркі Гомельшчыны. Ганаровыя граматы і каштоўныя падарункі ўладальнікам другіх і трэціх месцаў па выніках абласнога спаборніцтва ў дасягненні найвышэйшых паказчыкаў галіны, а таксама найлепшым аграномам уручылі старшыня абласнога Савета дэпутатаў Кацярына Зенкевіч і першы намеснік старшыні Гомельаблвыканкама Дзмітрый Петражыцкі.

Працягнулася святочная праграма запрашэннем на ўрачыстае адкрыццё абноўленых аб'ектаў Акцябрскага. Пасля рэканструкцыі адкрылі Алею герояў. Новае аблічча набыў установлены без малога сорак гадоў таму мемарыял «Сцяна прысвячэння», на якім змешчаны 21 барэльеф герояў-вызваліцеляў. У адкрыцці знакавага месца памяці Акцябрскага — знакамітага партызанскага краю — прынялі ўдзел першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Максім Рыжанкоў, кіраўнік спраў Прэзідэнта Юрый Назараў, старшыня Гомельскага аблвыканкама Іван Крупко, старшыня Акцябрскага райвыканкама Ірына Намачэнка, а таксама госці і ўдзельнікі фестывалю «Дажынкі».

Менавіта на тэрыторыі Акцябрскага раёна ў гады Вялікай Айчыннай вайны дзейнічаў партызанскі аэрадром, базіраваліся штабы Мінскага і Палескага партызанскіх злучэнняў, Мінскі падпольны абласны камітэт кампартыі Беларусі. У гэтым партызанскім краі выдаваліся падпольныя газеты: «Звязда», «Чырвоная змена», «Бальшавік Палесся», «Народны мсціўец». У 2009 годзе Указам Прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі гарпасёлак Акцябрскі быў узнагароджаны Ганаровай граматай і вымпелам «За мужнасць і стойкасць у гады Вялікай Айчыннай вайны».

Яшчэ адзін падарунак жыхарам раёна — новы спартыўна-забаўляльны комплекс. Тут размясціліся вулічныя трэнажоры, варкаўт-пляцоўкі і зоны для гульні ў футбол, валейбол, баскетбол. Цяпер ёсць дзе пакатацца на ролікавых каньках і скейтбордах. Для самых маленькіх устанавілі горкі, арэлі і замкавыя комплексы.

Традыцыйна яркай часткай абласнога фестывалю стала шэсце дэлегацый аграрыяў усіх раёнаў Гомельшчыны. На ўрачыстым прывітанні працаўнікоў старшыня Гомельскага аблвыканкама Іван Крупко перадаў сертыфікаты для ўмацавання матэрыяльна-тэхнічнай базы сельгасарганізацый вобласці.

Кіраўнік рэгіёна звярнуў увагу на вынікі жніва. З пачатку года працаўнікі аграпрамысловага комплексу Гомельшчыны вырабілі сельгаспрадукцыі на 5 % больш, чым за аналагічны перыяд мінулага года. Аграрыі рэгіёна атрымалі прыбытак больш як 1,6 мільярда рублёў, экспартная выручка на аднаго працаўніка ў галіне перавысіла 9 тысяч долараў. Агульны ўраджай збожжа, рапсу і кукурузы ў вобласці сёлета перавысіў мільён тон. Значны ўклад у вытворчасць зерня належыць кукурузе. Агульны намалот гэтай культуры ўдвая перавысіў леташні паказчык і склаў больш за 380 тысяч тон. Лідары па ўраджайнасці кукурузы — гаспадаркі Мазырскага і Буда-Кашалёўскага раёнаў.

Іван Крупко падкрэсліў, што, нягледзячы на ўсе выклікі сёлетняга сезона, аграрыі Гомельшчыны справіліся з пастаўленай перад імі задачамі.

— У першую чаргу хочацца павіншаваць усіх аграрыяў з прафесійным святам і падзякаваць за працу. Год выпрабаваў кожнага паасобку і ўсіх разам. Па выніках дзесяці месяцаў аб'ём вытворчасці таварнай прадукцыі склаў 105,2 працэнта. Гэты вынік дасць развіццё ў 2024 годзе, — пераканаў кіраўнік рэгіёна. — Выказваю словы падзякі Прэзідэнту і ўраду за падтрымку. Праведзена сур'ёзная мадэрнізацыя, што дае магчымасць усё рабіць своечасова. Думаю, у 2024 годзе нас чакае сур'ёзны прырост.

На галоўнай сцэне абласнога фестывалю «Дажынкі» ўзнагароды за годную працу атрымалі больш за 170 аграрыяў Гомельшчыны.

Як нагадаў Іван Крупко, падчас сёлетняга жніва першымі ў вобласці «тысячнікамі» сталі адразу тры экіпажы з гаспадаркі «Калінінскі» Добрушскага раёна — Сяргей і Аляксандр Белавусавы, Пётр Самойленка, Андрэй, Мікалай і Ілья Варганавы. Абсалютным лідарам па агульным намалоце збожжавых, зернебабовых, рапсе і кукурузе — механізатар «Саўгаса-камбіната «Зара» Мазырскага раёна Фёдар Яраш. Уклад аграрыя ў сёлетні агульны ўраджай — 8287 тон. Не менш уражвае вынік працы камбайнера РУП «Беларуснафта-Асобіна» Буда-Кашалёўскага раёна Андрэя Марцалёва. Камбайнерамі-«пяцітысячнікамі» сёлета таксама сталі працаўнікі «Саўгаса-камбіната «Зара» Аляксандр Астапенка, Андрэй Саўчык і Уладзімір Таболін. Усе лідары жніва дасягнулі такіх высокіх паказчыкаў за штурваламі менавіта айчыннай тэхнікі — камбайнаў «Гомсельмаш».

— Сёлета запаветную тысячу тон сабралі 14 маладзёжных экіпажаў, — адзначыў старшыня аблвыканкама.

Як нагадаў кіраўнік рэгіёна, «тысячнікамі» жніва на Гомельшчыне сталі і сямейныя экіпажы: муж і жонка Пётр і Наталля Астаповічы з РУП «Беларуснафта-Асобіна» Буда-Кашалёўскага раёна, бацька і дачка Юрый і Ангеліна Голуб, якія ўжо пятую ўборачную кампанію працуюць разам у КСУП «Абарона краіны». Акрамя таго, жніво-2023 прынесла Гомельшчыне больш за 200 працаўнікоў-кіроўцаў, якія перавезлі тысячу і больш тон збожжа, рапсу і кукурузы.

Пераможцаў абласнога спаборніцтва за дасягненне найвышэйшых паказчыкаў у сельскай гаспадарцы адзначылі ганаровымі граматамі, сертыфікатамі і каштоўнымі падарункамі. Кіраўнік спраў Прэзідэнта Юрый Назараў уручыў Ганаровую грамату Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь трактарысту-машыністу ААТ «Калінінскі» Добрушскага раёна Мікалаю Варганаву і трактарысту-машыністу СВК «Імя І. П. Мележа» Хойніцкага раёна Дзмітрыю Юшкевічу. Першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Максім Рыжанкоў уручыў грамату Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь за значны асабісты ўклад у развіццё сельскагаспадарчай вытворчасці дырэктару КСУП «Слабадское імя Леніна» Мазырскага раёна Юрыю Бажанкову.

На абласным фестывалі-кірмашы працягнулі традыцыю «Дажынак», закладзеную летась на Гомельшчыне. Ва ўрачыстай абстаноўцы была агучана сталіца абласных «Дажынак» у будучым годзе. Ёй стане гарадскі пасёлак Карма. Сноп з каласоў новага ўраджаю з палёў старшыня Акцябрскага райвыканкама Ірына Намачэнка перадала старшыні Кармянскага райвыканкама Дзмітрыю Шынкарэнку.

Наталля КАПРЫЛЕНКА.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Новым прэзідэнтам Аргенціны абраны Хаўер Мілей

Новым кіраўніком Аргенціны па выніках другога тура прэзідэнцкіх выбараў стаў Хаўер Мілей, паведаміла ТАСС. Дзеючы прэзідэнт Аргенціны Альберта Фернандэс заявіў, што гатовы пачаць працу па перадачы ўлады абранаму кіраўніку дзяржавы. Інаўгурацыя павінна адбыцца 10 снежня. Мілей узначальвае Лібертарыянскую партыю, якая ўвахадзіць у правы альянс «Свабода надыходзіць». Яго сапернікам на выбарах кіраўніка дзяржавы быў міністр эканомікі Аргенціны Серхіа Маса, які вылучаецца ад кіруючай кааліцыі «Саюз дзеля радзімы». Падчас прэзідэнцкай кампаніі Мілей заяўляў, што ў выпадку абрання правядзе беспрэцэдэнтную палітычную і эканамічную рэформу. У прыватнасці, ён абяцаў правесці даларызацыю эканомікі. Мілей таксама паведамляў, што скароціць дзяржаўныя выдаткі, закрыўшы міністэрствы культуры, адукацыі і культурнай разнастайнасці Аргенціны, а таксама адменіць дзяржаўныя субсідыі.

У Канадзе па прычыне забастовак настаўнікаў закрываюцца школы

Некалькі пачатковых і сярэдніх школ Манрэаля будуць закрыты па прычыне забастовак падчас перагавораў паміж прафсаюзам працаўнікоў сферы адукацыі і ўрадам Квебека, паведаміла CTV News. Сярэдняя школа Лестэра Пірсана будзе закрыта з 21 лістапада да 23 лістапада, а школа пры Цэнтры паслуг школьнікаў Маргарыты Буржуа закрыецца на нявызначаны перыяд з 21 лістапада, калі дамоўленасці не будуць дасягнуты. Бестэрміновая забастоўка праводзіцца сярод выкладчыкаў, якія з'яўляюцца членамі прафсаюза, што ўваходзіць у склад Аўтаномнай федэрацыі адукацыі (FAE). 6 лістапада 420 тысяч работнікаў дзяржаўнага сектара, у тым ліку настаўнікаў, ужо прымалі ўдзел у аднадзённай забастоўцы, каб аказаць ціск на ўлады Квебека з патрабаваннем аб павышэнні заробкаў і паляпшэнні ўмоў працы. У той дзень яны аб'явілі аб планах правесці яшчэ адну 21—23 лістапада.

Святочнае

Іван КУБРАКОЎ:

«Галоўная задача ўчастковых — дапамагаць людзям»

Аб гэтым міністр унутраных спраў заявіў падчас урачыстага сходу, прысвечанаму святкаванню 100-годдзя з Дня ўтварэння службы ўчастковых інспектараў міліцыі

Кіраўнік ведамства ўзнагародзіў найлепшых прадстаўнікоў гэтай прафесіі, ветэранаў, бацькоў супрацоўнікаў, якія вызначыліся ў службе. Акрамя таго, міністр уручыў пагоны супрацоўнікам органаў унутраных спраў і вайскоўцам унутраных войскаў МУС.

Адкрываючы ўрачысты сход, прысвечаны святкаванню 100-годдзя з Дня ўтварэння службы ўчастковых інспектараў міліцыі, Іван Кубракоў адзначыў, што ў зале сабраліся супрацоўнікі, якія паказалі высокія вынікі службовай дзейнасці, працуючы 24 на 7. «Вялікі дзякуй за тое, што вы робіце, прымаючы на сябе немалую плыню зваротаў грамадзян, — звярнуўшыся да ўчастковых інспектараў міліцыі, заўважыў міністр. — Прычым яны не заўсёды датычацца кампетэнцыі органаў унутраных спраў».

Кіраўнік міліцэйскага ведамства ўдакладніў, што, нягледзячы на векавы юбілей, служба ўчастковых вельмі маладая. Па яго словах, каля 70 % асабовага складу — гэта супрацоўнікі, якія прапрацавалі менш за дзесяць гадоў. Маладыя міліцыянеры ўмеюць знаходзіць патрэбныя словы як для пажылых людзей, так і для падрастаючага пакалення.

«Сёння галоўная задача ўчастковых — прафілактыка, — звярнуў увагу Іван Кубракоў. — Вашы намаганні выратоўваюць чалавечыя жыцці, вас паважаюць, вам даверяюць, вы дапамагаеце людзям. Сто гадоў прадстаўнікі вашай службы стаяць на варце бяспекі нашых грамадзян. За гэтыя гады мянялася матэрыяльна-тэхнічная база, развівалася служба, але нязменным заставалася адно: задачы, якія стаяць перад участковымі інспектарамі міліцыі. Галоўная з іх — дапамагаць людзям, і вы з гэтай задачай спраўляецеся на выдатна».

Кіраўнік ведамства падкрэсліў, што не кожны супрацоўнік зможа выконваць гэтую работу. Участковы абавязкова павінен быць камунікабельным, сапраўдным прафесіяналам, разумець і любіць людзей.

Міністр унутраных спраў выказаў удзячнасць ветэранам службы, родным і блізкім супрацоўнікаў, якія чакаюць іх дома. Асаблівыя словы падзякі — бацькам участковых, што выхавалі сапраўдных патрыётаў краіны, службоўцаў, якія ў любы час сутак гатовы прыйсці на дапамогу.

Вераніка КАНЮТА.
Фота прэс-службы МУС.

Тонкасці прафесіі

Напэўна, няма больш народнай прафесіі, чым участковы інспектар міліцыі. Менавіта ён найбліжэйшы да людзей: ведае, якімі праблемамі жыве кожная сям'я, дапаможа ў складанай сітуацыі, дасць слушную параду. Для жыхароў, асабліва ў сельскай мясцовасці, участковы — гэта і крыніца інфармацыі, і першая дапамога пры любых здарэннях, і надзейная абарона ад сямейных дэбашыраў. Аднак не ў кожнай кватэры рады людзям у пагонах, а таму служба ўчастковых інспектараў міліцыі заўсёды спалучана з рызыкай. Заступаючы на змену, яны ніколі не ведаюць, калі і як скончыцца працоўны дзень. Ненармаваны графік, гатоўнасць у любы час сутак прыбыць па ўказаным адрасе, штодзённае ўзаемадзеянне са спецыфічным кантынгентам — не кожны можа вытрымаць такой сур'ёзнай фізічнай і маральнай нагрузкі.

Аднак выпадковых людзей сярод участковых няма. Яны свядома выбіраюць гэтую службу, а таму не баяцца ні цяжкасцяў, ні непрадбачаных сітуацый. Нярэдка ва ўчастковыя ідуць сем'ямі. І неабавязкова сыны працягваюць справу сваіх бацькаў або дзядоў. Як бы ні казалі аб мужчынскім складніку гэтай прафесіі, нямала сярод участковых інспектараў і жанчын. Нягледзячы на знешнюю далікатнасць і мяккі характар, яны годна і адказна нясуць службу, спраўляючыся з пастаўленымі задачамі не горш, а дзесьці нават і лепш за мужчын.

ШЛЯХ ДА МАРЫ

У тым, што няма нежаночых прафесій, днямі пераканаліся і карэспандэнты «Звязды». Разам з участковымі інспектарамі міліцыі аддзела аховы правапарадку і прафілактыкі РУУС Першамайскага раёна г. Мінска Юліяй і Кірылам Башкевічамі мы накіраваліся ў рэйд. Звычайна муж і жонка адпрацоўваюць жылы фонд паасобку — у кожнага з іх свой участак. Аднак калі Юлія збіраецца наведаць кватэры, гаспадары якіх знаходзяцца на прафілактычным уліку ў органах унутраных спраў па прычыне злоўжывання алкагольнымі напоямі, а адпаведна і вядзення асацыяльнага ладу жыцця, Кірыл суправаджае жонку (пры ўмове, калі са сваімі задачамі справіўся). Сёння ў плане рэйдавага мерапрыемства — адзін з такіх адрасоў. Але аб усім па парадку.

Перш-наперш Юлія і Кірыл Башкевічы плануюць завітаць да жыхаркі па вуліцы Валгаградскай. Жанчына звярнулася ў органы ўнутраных спраў з просьбай дапамагчы адшукаць пашпарт. Міліцыянеры яе добра ведаюць — грамадзянка ўжо не першы раз тэлефануе на «102», прычым здараецца ў яе заўсёды адно і тое ж: губляецца пашпарт.

Пакуль ідзём па маршруце, знаёмімся. Юлія родам з Асіповічаў. Колькі сябе памятае, столькі хацела насіць пагоны. На гэта паўплываў бацька — афіцэр Узброеных Сіл, цяпер падпалкоўнік у адстаўцы. Мама таксама ўсё жыццё адпрацавала ў воінскай часці, праўда, на цывільнай пасадзе. Толькі ў арміі Юля сябе не бачыла: дзяўчына не хацела працаваць з тэхнікай, ёй бліжэй былі ўзаемаадносіны з людзьмі. Аб тым, што хоча служыць у міліцыі, зразумела падчас навучання ў Мінскім абласным кадэцкім вучылішчы, куды паступіла пасля сёмага класа.

«Бацькі не адразу ўспрынялі маё рашэнне ўсур'ёз, — прызнаецца старшы лейтэнант міліцыі. — Тата казаў, што жанчыне ў органах унутраных спраў будзе складана. Вучоба ў вучылішчы, самастойнасць, дысцыпліна толькі загартавалі мой характар, і бацька пераканаўся, што ў мяне ўсё атрымаецца».

Шлях да мары быў няпросты. У той год, калі Юлія вырашыла паступаць у Акадэмію МУС, на факультэт міліцыі (а іншых варыянтаў яна нават не разглядала) дзяўчат не набіралі. Але здавацца —

Ноу-хау

У ЗДАРОВЫМ ЦЕЛЕ — ЗДАРОВЫ ДУХ

У Акадэміі МУС з'явіўся яшчэ адзін спартыўны аб'ект

На факультэце міліцыі грамадскай бяспекі ведамаснай установы вышэйшай адукацыі ўрачыста адкрылі трэнажорную залу. Абсталяваць яе па самых высокіх стандартах дапамаглі Прэзідэнцкі спартыўны клуб і намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Дзмітрый БАСКАЎ.

Як нагадаў **начальнік Акадэміі МУС генерал-маёр міліцыі Аляксандр ВАСІЛЬЕЎ**, летась трэнажорная зала з'явілася на факультэце крымінальнай міліцыі, перад гэтым аналагічны аб'ект запрацаваў у акадэмічным корпусе па вуліцы Багратыёна, 85. «Сімвалічна, што ў рамках святкавання 100-гадовага юбілею службы ўчастковых інспектараў міліцыі мы зноў пераразаем чырвоную стужку новага спартыўнага аб'екта, — адзначыў кіраўнік міліцэйскай ВНУ. — З першых дзён навучання мы выхоўваем у курсантах імкненне да здаровага ладу жыцця і падтрымання выдатнай фізічнай формы. У гэтым пытанні нам вельмі прыемна адчуваць падтрымку міліцэйскага ведамства, рэспубліканскага дзяржаўна-грамадскага аб'яднання «Прэзідэнцкі спартыўны клуб» і неабыякавых да спорту людзей».

Сучасны спартыўны аб'ект, які з нецярплівасцю чакалі курсанты, афіцэры і выкладчыкі, ужо прыняў першых наведвальнікаў. Сярод іх — і сталічныя школьнікі, якія з'яўляюцца выхаванцамі трох патрыятычных клубаў акадэміі.

Акрамя таго, на факультэце міліцыі грамадскай бяспекі пачаў працаваць кабінет псіхалагічнай разгрузкі для правядзення кансультатыўных, прафілактычных і аднаўленчых мерапрыемстваў. Кабінет складаецца з некалькіх памяшканняў, падзеленых па функцыянальным прызначэнні: для дыягностыкі, карэкцыі і рэлаксацыі. У афармленні выкарыстаны спецыяльныя інтэр'ерныя і колерагукавыя рашэнні, інтэрактыўныя святлотэхнічныя прыборы, дамашні кінатэатр з бібліятэкай спецыяльных аўдыя-, відэапраграм.

Вераніка КАНЮТА.
Фота прэс-службы Акадэміі МУС.

Калі служба — справа сямейная

Карэспандэнты «Звязды» накіраваліся ў рэйд з участковымі інспектарамі міліцыі Юліяй і Кірылам Башкевічамі

не ў яе характары. І дачка афіцэра паступіла ў Магілёўскі інстытут МУС — у выніку стала адной з дваццаці дзяўчат на курсе, якім пашчасціла адзець курсанцкія пагоны знакамітай міліцэйскай ВНУ.

У сям'і Кірыла ніхто не служыў (бацька — ветэрынарны ўрач, мама — настаўніца), але малады чалавек марыў пра міліцэйскія пагоны. У школьным узросце захапляўся дэтэктывамі і, як любімыя героі кінафільмаў, хацеў расследаваць злачынствы і дапамагаць людзям. У той жа час малады чалавек не ўяўляў сябе без спорту: на сур'ёзным узроўні займаўся вольнай барацьбой. Часова спартыўныя захапленні перамаглі: Кірыл паступіў у Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт фізічнай культуры. Аднак, скончыўшы навучальную ўстанову, вырашыў, што пойдзе служыць у міліцыю.

«Цікавая служба, стабільны заробак, сацыяльны пакет — усё гэта паўплывала на маё рашэнне застацца ў органах унутраных спраў», — прызнаецца ўчастковы інспектар. Кірыл заўважае, што і спартыўныя навыкі, фізічная вынослівасць у дзейнасці ўчастковага інспектара не бываюць лішнімі.

УВАГА КОЖНАМУ

Спыняемся каля патрэбнага пад'езда. На лаўцы сядзіць пажылая жанчына.

«Любоў Аляксееўна, добры дзень! А мы акурат да вас, — пазнае пенсіянерку капітан міліцыі. — Нам паведамілі, што вы страцілі пашпарт».

«Добры дзень, — як добрых знаёмых сустракае міліцыянераў жанчына. — Ой, вы ведаеце, я ўжо яго знайшла. Памяць дрэнная стала: забылася, куды паклала. Цяпер вось з сабой нашу *(паказвае на ўнутраную кішэню ў паліто)*».

«Пашпарт больш не губляйце», — далучаецца да размовы Юлія і пытаецца, як у жанчыны здароўе, хто дапамагае ёй у побыце.

«А што мне дапамагаць? Калі патрэбна, я і сама каму заўгодна дапамагу».

Карыстаючыся выпадкам, супрацоўнікі міліцыі расказалі пенсіянерцы аб тым, што пачасціліся выпадкі махлярства па тэлефоне: зламысныкі тэлефануюць грамадзянам і, прадстаўляючыся праваахоўнікамі, прапануюць паўдзельнічаць у «спецаперацыі» па пошуку злодзея. Або тэлефануюць і кажуць, што нехта са сваякоў абанента трапіў у аварыю, а за тое, каб не ўзбуджаць крымінальную справу, просяць немалыя грошы. Любоў Аляксееўна расказала, што падобныя званкі да яе ўжо паступалі, але яна адразу зразумела, хто з ёй размаўляе і якія ў іх намеры, а таму паклала трубку.

Пахваліўшы грамадзянку за пільнасць, а таксама пажадаўшы здароўя і ўважлівасці да асабістых рэчаў, участковыя інспектары міліцыі рушылі далей. Кірыл прызнаецца, што за сёмы год службы здзівіць яго пэўнай жыццёвай сітуацыяй складана. І такіх адзінокіх жанчын, як Любоў Аляксееўна, на сваім шляху ён сустракаў не раз. «Яны тэлефануюць у міліцыю, бо іх тут уважліва выслухаюць, прапануюць дапамогу і проста пагутараць з тымі, каму гэта неабходна», — тлумачыць участковы інспектар.

НА СВАІМ МЕСЦЫ

Як прызнаюцца Юлія і Кірыл Башкевічы, жыхары іх участкаў не ведаюць, што яны — муж і жонка. Прафесійную этыку ніхто не адмяняў. У падраздзяленні ж пра іх узаемаадносіны таксама рэдка хто здагадваўся, пакуль мінулым летам маладыя людзі не аформілі шлюб. Адно прозвішча — тут і хацеў бы, ды не схаваеш. А яны і не спрабуюць, нават жартуюць, што калі б не Першамайскае РУУС сталіцы, якое з'яўляецца першым працоўным месцам як для Юліі, так і для Кірыла, то ўвогуле маглі б не сустрэцца.

Яна служыць тут чацвёрты год, ён — ужо амаль шэсць. Вядома, як больш вопытны, Кірыл нярэдка дае жонцы парады: напрыклад, як паводзіць сябе з агрэсіўнымі грамадзянамі або як знайсці падыход да чалавека, які не хоча дзяліцца падрабязнасцямі сітуацыі, з якой звярнуўся ў міліцыю. Часта маладыя людзі абмяркоўваюць, як кожны з сужэнцаў паступіў бы ў тым ці іншым выпадку.

«Кожная жыццёвая сітуацыя не падобная на папярэднюю, а таму цікавасць да службы ўзнікла ў першы ж працоўны дзень, — згадвае Юлія. — Хочацца хутчэй разабрацца па ўсіх заявах, дапамагчы людзям. Пры гэтым вельмі пашанцавала з калектывам: з кожным можна параіцца, калі трэба, папрасіць дапамогі».

Па першым часе старшы лейтэнант міліцыі па жылым сектары хадзіла з настаўнікам — вопытным афіцэрам. Цяпер у асноўным спраўляецца сама. Калі неабходна наведаць кватэры, якія стаяць на прафілактычным уліку, ніхто з участковых па адным не ходзіць. Тым больш рызыкоўна адпраўляць туды адну дзяўчыну.

Працягваем рэйд. Тэлефануем у дамафон. Як і прадбачылі, дзверы ніхто нам не адчыняе. Акурат да пад'езда накіроўваецца пажылы мужчына: па ўсім відаць, што тут жыве. Капітан міліцыі просіць дазволу трапіць у пад'езд — і мы падымаемся на патрэбны паверх.

Ні адну хвіліну ўчастковы інспектар нацыскае на званок — напэўна, дзверы адчыняе гаспадар. Цяжка ўявіць, як ён дайшоў да парога, бо знаходзіцца ў моцным алкагольным ап'яненні. Аляксандр Пятровіч не працуе: ён інвалід другой групы. Аднак сур'ёзны дыягназ не перашкаджае яму злоўжываць алкаголем. Кватэра ўжо даўно патрабуе генеральнай прыборкі, а твар гаспадара — медыцынскай дапамогі.

«Вам трэба клапаціцца аб сваім здароўі», — звяртаецца да мужчыны Кірыл.

«Маё здароўе — гэта мае праблемы, — адказвае той. — Ды і выпіў сёння зусім трохі. Памятаю нашу гутарку тыдзень таму, калі абяцаў кінуць піць. Я стараюся».

Участковыя інспектары міліцыі размаўляюць з грамадзянінам на прадмет таго, каб узяў сябе ў рукі і кінуў выпіваць, а таксама не вадзіў у кватэру незнаёмцаў.

Ужо пасля таго, як мы пакінулі гэтае жыллё, якое, мякка кажучы, знаходзіцца ў антысанітарным стане (неаднаразова за гэта гаспадар прыцягваўся ЖЭСам да адміністрацыйнай адказнасці, але штрафы не плаціць), супрацоўнікі міліцыі расказваюць, што мужчына на кантролі органаў унутраных спраў ужо не першы год. «Ен выпівае, прымае ў кватэры старонніх, — уводзіць у курс справы капітан міліцыі. — У лячэбна-працоўны профілакторый не накіруеш, бо мае інваліднасць. Мы яго наведваем кожны тыдзень, праводзім прафілактычныя гутаркі. Грамадзяніна паказалі нарколагу, цяпер сітуацыя пад кантролем».

Пасля размовы з намі своеасаблівы лікбез Кірыл праводзіць для Юліі: «Калі прыходзіш у такія кватэры і людзі там цвярозыя, то яны больш-менш адэкватна рэагуюць на нашы просьбы. Калі ж п'яныя, то форма для іх — як чырвоная ануча для быка, таму не варта нечага патрабаваць».

Малады чалавек лічыць, што прафесія ўчастковага інспектара міліцыі складаная для жанчыны. Аднак Юлія ўпэўнена: яна знаходзіцца на сваім месцы. Кожны раз пераконваецца ў гэтым, калі грамадзяне пазнаюць на вуліцы і выказваюць удзячнасць за вырашэнне іх праблемы. Хтосьці дзякуе, што ўчастковы інспектар міліцыі паспрыяла, каб чалавек кінуў піць і пачаў жыць без залежнасці.

«Прафілактычная работа дае свой плён, — заўважаюць сужэнцы Башкевічы. — Пастаянны кантроль з боку супрацоўнікаў органаў унутраных спраў дысцыплінуе людзей. Многія задумваюцца над тым, да чаго можа прывесці асацыяльны лад жыцця, таму становяцца на шлях выпраўлення».

ВЫСЛУХАЦЬ І ДАПАМАГЧЫ

Практычна кожны дзень участковыя інспектары міліцыі сутыкаюцца з пытаннямі, як кажуць, не па профілі. Грамадзяне давяраюць людзям у пагонах, а таму звяртаюцца менавіта да іх. А міліцыянеры ніколі не адмаўляюць: заўсёды выслухаюць і падкажуць.

Па прыклады далёка хадзіць не трэба. Да Юліі падыходзіць мужчына і кажа, што заблукаў. Яму патрэбна трапіць у будынак, дзе размяшчаецца дабрачынны фонд, а навігатар, па словах мінака, вядзе па іншым маршруце. Удакладніўшы ў грамадзяніна адрас, куды ён ідзе, участковы інспектар міліцыі адкрывае на тэлефоне карту і паказвае мужчыну, што той знаходзіцца ад патрэбнага будынка ўсяго за некалькі метраў. Узрадаваны грамадзянін дзякуе і развітваецца з намі.

«Можна спытаць?» — раптам чуем жаночы голас.

Да міліцыянераў падыходзяць дзве дзяўчыны з каляскамі — па ўсім відаць, маладыя маці выйшлі з немаўлятамі на прагулку. Адна з іх расказала, што днямі ледзь не паверавала ашуканцам пэўную суму грошай. У інтэрнэце Вераніка натрапіла на прапанову купіць новы тэлефон па меншай цане, чым у краме. Маладая маці вырашыла ажыццявіць пакупку, але ў апошні момант сарыентаваў муж: адразу тавар, а потым — грошы. Ашуканцам, вядома, такія ўмовы не спадабаліся.

«Пакупкі праз інтэрнэт — гэта хутка і зручна. Як пераканацца ў тым, што цябе не падманваюць?» — агучыла сваё пытанне супрацоўнікам міліцыі маладая мама. Юлія і Кірыл распавялі пра тыповыя схемы падману, якімі апошнім часам карыстаюцца кіберзлачынцы, і нагадалі правілы інфармацыйнай гігіены. Падзякаваўшы за падрабязную кансультацыю, дзяўчаты развіталіся.

Прыйшоў час развітвацца і нам. У карэспандэнтаў працоўны дзень завяршаецца, ва ўчастковых інспектараў міліцыі ён у самым разгары. Дахаты яны прыходзяць практычна апоўначы. Але калі неабходна, гатовы выехаць па патрэбным адрасе нават ноччу і ў свой выхадны дзень. І гэта не нюансы прафесіі, як многія думаюць, а лад жыцця. Кірыл і Юлія Башкевічы не ўяўляюць яго па-іншаму. Аднойчы адзеўшы пагоны, яны абралі шлях служэння Радзіме і людзям, аб чым ніколі не пашкадавалі. Дзякуючы прафесіі пазнаёміліся і стварылі сям'ю. Цяпер для іх служба — справа сямейная.

Вераніка КАНЮТА.
Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов по продаже имущества ОАО «ТРЕСТ БЕЛСТРОМРЕМОНТ» в форме открытого аукциона

№ Лота	Наименование предмета торгов	Начальная стоимость с учетом НДС 20 %, бел. руб.	Задаток, бел. руб. (10 %)	Шаг аукциона, бел. руб. (5 %)
1	Вибратор, инв. 146	5,40	0,54	0,27
2	Генератор сварочный EP200X-XC-200АД (только двигатель), инв. 434	31,32	3,13	1,57
3	Дрель ударная GSB 19-2 RE (н/раб.), инв. 756	3,60	0,36	0,18
4	Компьютер CDL с монитором «Самсунг», клавиатура системник (н/раб.), инв. 708	2,99	0,30	0,15
5	Компьютер, монитор «Самсунг» 795, инв. 436	1,55	0,15	0,08
6	Компьютер, инв. 525	1,91	0,19	0,10
7	Нивелир НИ-3 (н/раб.), инв. 419	6,48	0,65	0,32
8	Нивелир НИ-3 (н/раб.), инв. 606	3,17	0,32	0,16
9	Нивелир (н/раб.), инв. 597	3,17	0,32	0,16
10	Нивелир (н/раб.), инв. 60048-а	3,56	0,36	0,18
11	Перфоратор SDS plus Bosch GBH 2-28 DFV Герм (н/раб.), инв. 753	3,60	0,36	0,18
12	ПЭВМ «Сильверадо» (мышь, монит. 19, клав.) без сист. комплект., инв. 500	1,40	0,14	0,07
13	Смеситель ЕМ1-950К (н/раб.), инв. 629	3,96	0,40	0,20
14	Телефакс, инв. 98	0,43	0,04	0,02
15	Теодолит 3Т5КП (н/раб.), инв. 794	18,36	1,84	0,92
16	Имущество, согласно списку № 1: https://docs.google.com/document/d/10hhmUCHJEaF-grL8W6ro54bLs4rESFdz/edit?usp=drive_link&ouid=107336927377324979075&rtpof=true&sd=true	194,22	19,42	9,71
17	Имущество, согласно списку № 2: https://docs.google.com/document/d/1TZ6DIdAX3VN93T4FOyH4T1ciBpVu-C0G/edit?usp=drive_link&ouid=107336927377324979075&rtpof=true&sd=true	686,25	68,62	34,31
18	1. Гигром. психометр (госповерка); 2. Гигрометр (РФ) д/измер. влажн. стр. мат. Testo 606-1; 3. Гигрометр психометрический ВИТ-1 (госповерка); 4. Измеритель влажн. матер.	172,80	17,28	8,64
19	1. Дорожные плиты, 4 шт.; 2. 3ПБ 16-37п; 3. КЦ 10-6; 4. ПК 24.12.4; 5. ПК 27.12.8; 6. ПТМ72.15.22-8,0 S800-2а (плиты пустотного настила), 2 шт.; 7. ПТМ75.12.22-8,0 S800 3а	681,60	68,16	34,08
20	Имущество, согласно списку № 3: https://docs.google.com/document/d/1pcqR_6xO9IUEAzuaZs2ftBj5O3OOJ2h1/edit?usp=drive_link&ouid=107336927377324979075&rtpof=true&sd=true	309,60	30,96	15,48
21	1. Дальномер лазерный GLM 80 BOSCH (рулетка эл.); 2. Эл. уровень	157,20	15,72	7,86
22	1. Шпилька 12*2000 рез. Штанга, 0.003 т. шт.; 2. Шпилька резьбовая 16*2000, цинк, 0,036 т. шт.; 3. Шпилька резьбовая цинк 6*2000,0.002 т. шт.; 4. Шпилька резьбовая цинк 8*1000,0.002 т. шт.	160,20	16,02	8,01
23	1. Домкрат 111-3913010 (25 тонн); 2. Домкрат 12-3913010	678,60	67,86	33,93
24	1. Каска защ. СОМ3-55, 3 шт.; 2. Каска защитная Б. б/у; 3. Каска-бейсболка Каскетка цв. син., 2 шт.; 4. Халат жен. «Гренада»; 5. Кепи-бейсболка	18,60	1,86	0,93
25	Имущество, согласно списку № 4: https://docs.google.com/document/d/14qYa5M3qlYWZZZqThxOXUSnGxrLUvh4B/edit?usp=drive_link&ouid=107336927377324979075&rtpof=true&sd=true	299,04	29,90	14,95
26	1. Миксер-дрель МД1-11Э (1100 Вт) без насадки «Фиолент»; 2. Шнур каменщика 30 м (госповерка); 3. Штангенциркуль ШЦ-II-250 (0,05) (госповерка); 4. Кельма из нерж. стали 160 мм; 5. Емкость строит. круглая 45 л.; 6. Шлифшкурка на бум. основе (рулон 115 мм*50 м), 22 м. п.; 7. Тачка строит. ТС-2; 8. Ножницы по металлу 260 мм прямые; 9. Ножовка для газобетона 630 мм, 34 тверд., 2 шт.; 10. Молоток-кирка 0,7 кг дер. ручка	185,40	18,54	9,27
27	1. Перчатки диэлектр. бесшовные, 2 пары; 2. Розетка 1-гнезд. с/заз; 3. BYLECTRICA откр. уст. белая; 4. Розетка на удлинитель 1-гнезд. переносная, каучук.; 5. Розетка силовая РЕ 5*32А 3Р+РЕ+N с креплением; 6. Удлинитель 3-фазный ПВС 5*4; 7. Удлинитель L=10 м; 8. Удлинитель L=20 м, 2 шт.; 9. Удлинитель L=40 м; 10. Удлинитель У10-001 10 м, 3 шт.; 11. Разъем сил. вилк. 3SP1-024 63А; 12. Разъем силовой НТ-025 32А; 13. Разъем силовой НТ-125 32А, 2 шт.; 14. Провод ПВС 3*2,5(м), 31 м.; 14. Провод ПВС 5*4 (м), 42 м.; 15. Стартер ST 111 BASIC смол., 24 шт.; 16. Разъем РШ/ВШ-30, 11 шт.	277,80	27,78	13,89
28	1. Форма куба ЗФК-100 (госповерка); 2. Форма куба ЗФК-100 (госповерка); 3. Форма куба ЗФК-100 (госповерка)	180,00	18,00	9,00
29	1. Стол компьютерный; 2. Стол письменный 2-тумб. зак., 2 шт.; 3. Стол приставка заказная 1,0, 2 шт.; 4. Шкаф 47*40*217	101,40	10,14	5,07
30	1. Тел. сот. Nokia x2-02 RM-694; 2. Факс Panasonic KX-FT 982 RU-B	68,40	6,84	3,42
31	1. Щит учета (зд. проходной); 2. Щит учета № 1; 3. Щит учета № 2; 4. ЩУРН-3ф передвижной с ДМ; 5. Трансформатор	145,80	14,58	7,29
32	1. Эл. чайник «Люкс» 1.7 л; 2. Электрочайник «Атлант»1,8/1,9-220 ЭЧТЗ с д/м; 3. Электрочайник «Атлант» 1,8/1,9-220 ЭЧТЗ с д/м; 4. Электрочайник Polly № 1,7 л с сигнал. рубин (нерабочий); 5. Электрочайник ЭЧТ31,8/1,9-220 01 «Атлант» с д/м н/р; 6. Мешки пылесб. ECO-104 к пылесосам BOSCH PAS, 4 шт.; 7. Замок врезной мод. Ш 025Б; 8. Гладилка швейц. 13*58; 9. Обогреватель электр. масл. 1,5 кВт; 10. Печь СВЧ «HORIZONT» 17 MW700-1378B, 2 шт.	179,40	17,94	8,97
33	1. Стол письмен. с приставкой; 2. Стол прист. заказ. 0,9х0,45; 3. Стол приставка заказная 0.6	128,40	12,84	6,42
34	1. Электродвигатель АИР 100S4; 2. Электродвигатель ИВ-117-2	174,00	17,40	8,70
35	1. Чайник электрич. POLLY-Люкс; 2. Чайник электрич. POLLY-Люкс ЕК-20; 3. Чайник электрич. POLLY-Люкс ЕК-20; 4. Чайник электрич. ЭЧТЗ 1,8/1,9-220 мод.01 «Атлант»; 5. СВЧ-печь; 6. Рукосушитель автоматический	108,60	10,86	5,43
36	Теодолит 3 т 5КП № 36056	840,00	84,00	42,00
37	1. Струбцина ленточн. для стяжки полов 120*5000, 2 шт.; 2. Съемник проф. 300 мм; 3. Тачка WB5009 R; 4. Тиски для труб № 2 б/у; 5. Толщиномер неотвердевшего слоя «Константа» ГЗ (ГП); 6. Топор А-0 0,9 кг в сборе 1,2 кг; 7. Топор метал. с дерев. топорищ. 10514; 8. Траверса; 9. Траверса; 10. Набор щупов. (госповерка); 11. Насос электр. профес. погружной; 12. Ножницы по мет. 260 мм; 13. Кувалда, 3 кг	155,40	15,54	7,77
38	1. Углометр с нониусом (РФ) 4УМ (10') (госповерка); 2. Угольник слесар. 160*100 3 кл.; 3. Угольник столярный 1000 мм; 4. Рулетка 3 м (госповерка)	250,80	25,08	12,54
39	1. Теодолит 2 т 30П № 09628; 2. Рейка измерительная GR500 TELESKOP-NIV, BOSCH	398,40	39,84	19,92
40	1. Труба в\ст 5005 п\э, 8.24 м.; 2. Труба водосточная, 4 шт.; 3. Рукав 111-9-2.0, 40 м. п.; 4. Отвод желоба ОЖВ120/О-ПЭ-С; 5. Отвод желоба ОЖВ150/О-ПЭ-С, 2 шт.; 6. Манометр МП-50; 7. Манометр МП-63; 8. Клапан обратный; 9. Водомерный узел	72,28	7,23	3,61
41	1. Сварочный аппарат JASIC ARC 200; 2. Резак проп. Р1 «Донмет» 142; 3. Резак проп. РС-3П-100 (9/9) «РО-АР»; 4. Регулятор РДСГ 1-0,5 (50 л); 5. Редуктор БКО-50-4м кислород; 6. Щиток защит. лиц. для электросвар., 2 шт.; 7. Маска (щиток) сварщика ННП-У1; 8. Редуктор углекислотный УР-6-6; 9. Подогреватель ПУ-1 (для подогрева углекислоты)	186,00	18,60	9,30
42	1. Замок клиновый, 75 шт.; 2. Замок универс. оц., 55 шт.; 3. Кронштейн подмостей, 25 шт.	648,00	64,80	32,40
43	Имущество, согласно списку № 5: https://docs.google.com/document/d/1l3vPdVS8bAXiRVgH6-J50hWNstVovCuy/edit?usp=drive_link&ouid=107336927377324979075&rtpof=true&sd=true	321,96	32,20	16,10
44	Лист проф. гладк. П-1250*L/0,5-ЛКПЦ-Пэ-С-RAL9003, 1,25 м²	4,50	0,45	0,23
45	1. Захват для бордюр, 3 шт.; 2. Захват крановый «Гамма», 2 шт.	295,20	29,52	14,76
46	Жидкотопливный воздухонагреватель МАК 25	462,00	46,20	23,10
47	1. Дрель GBM 10-2 RE (БЗП); 2. Дверной блок ДГФ 2,1х1,0 межкомнатный; 3. Диск 190*2,0*30 мм; 4. Заклепка 4,0*8 ZK алюм./ст., 0,23 т.шт.; 5. Заклепочник 250 мм; 6. Абраз. сетка 115/280 (50 шт.), 2 упак.; 7. Вибронаконечник к ИВ-117 ф51; 8. Бур садовый ф250; 9. Ведро пожарное, 2 шт.; 10. Грунтовка белая «Тайфун мастер» № 100, 10 кг; 11. Лампа паяльная 1,5 л., 2 шт.; 12. Припой ПОС-61 ф3 мм (фас. 1 кг), 0,6 кг; 13. Уровень МААN 1200 мм; 14. Уровень брусковый 1,0 м; 15. Огнетушитель ОП-4(3), 3 шт.; 16. Огнетушитель ОП-5, 2 шт.	348,66	34,87	17,43
48	Измеритель адгезии АР (решетка)	252,00	25,20	12,60
49	1. Кресло «Престиж», 5 шт.; 2. Полка навесная	163,20	16,32	8,16
50	Печь отопительно-варочная НОРМАЛЬ-2 антрацит. труб	126,00	12,60	6,30
51	Имущество, согласно списку № 6: https://docs.google.com/document/d/1NJLLpjwfAkJpMzz_yEL2Kkdh-a_g-Cdd/edit?usp=drive_link&ouid=107336927377324979075&rtpof=true&sd=true	631,40	63,14	31,57
52	Станок фуговальный, инв. № 37883	92,40	9,24	4,62
53	Станок лесопильный, инв. № 37881	79,20	7,92	3,96
54	1. Сканер Epson Perfection V33 Финляндия; 2. Сот. тел. Nokia 359030441011 68; 3. Стул PR ST Pt; 4. Излучатель эл. инфракр., 2 шт.	266,40	26,64	13,32

В отношении лотов №№ 1–15 проводятся восьмые повторные торги. **Стоимость имущества снижена на 97 %.**
В отношении лотов №№ 16–51 проводятся четвертые повторные торги. **Стоимость имущества снижена на 50 %.**
Ранее публикация о проведении аукциона размещалась в газете «Звязда» № 190 (30070) от 30.09.2023, стр. 10.
В отношении лота № 52 проводятся восьмые повторные торги. **Стоимость имущества снижена на 90 %.**
В отношении лота № 53 проводятся седьмые повторные торги. **Стоимость имущества снижена на 85 %.**
Ранее публикация о проведении аукциона размещалась в газете «Звязда» № 166 (30046) от 29.08.2023, стр. 6.
В отношении лота № 54 проводятся первые торги

Дата и время проведения открытого аукциона	В отношении лотов №№ 1–53: **5 декабря 2023 года в 12.00 (регистрация – с 11.30 до 11.55)** В отношении лота № 54: **22 декабря 2023 года в 12.00 (регистрация – с 11.30 до 11.55)**
Срок приема заявлений и оплаты задатка	В отношении лотов №№ 1–53: с 10.00 21.11.2023 до 16.00 01.12.2023 года В отношении лота № 54: с 10.00 21.11.2023 до 16.00 21.12.2023 года
Местонахождение имущества	В отношении лотов №№ 1–51, 54: г. Гродно, ул. Дубко, д. 11 В отношении лотов №№ 52, 53: г. Гомель, ул. Пригородная, 31

Условия для участия в торгах:
1. До подачи заявления необходимо внести задаток на р/с BY36ALFA30122215570040270000, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: **OTHR 40901.** Задаток для участия в торгах по Лоту ___, ОАО «ТРЕСТ БЕЛСТРОМРЕМОНТ», проводимых __.__._____.
2. Заявление на участие (на каждый лот отдельное) и необходимые документы (соглашение о правах и обязанностях сторон в 2 экземплярах (на каждый лот отдельное), копия платежного поручения о перечислении задатка, копия паспорта (стр. 31–33, действующая прописка); копия свидетельства о государственной регистрации – для ИП и юр. лица; документ, подтверждающий полномочия руководителя или представителя юр. лица, копия Устава – для юр. лица) принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127. Документы могут подаваться посредством направления почтой (220113, г. Минск, а/я 524) или личной подачи. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления являются дата и время получения организатором торгов оригинала заявления на участие в аукционе и полного пакета прилагаемых документов (в случае направления почтой – дата и время поступления документов на абонентский ящик организатора торгов). По вопросу подготовки необходимых документов для участия в аукционе обращаться по тел.: +375293082897, +375293058650.
3. К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление с приложением необходимых документов и зарегистрированные в журнале регистрации на участие в торгах. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов.
4. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона.
5. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона (вознаграждение аукциониста и затраты по размещению публикации в газете) на основании счета-фактуры и акта в течение 5 (пяти) календарных дней со дня проведения аукциона. **Вознаграждение аукциониста – 7 % (семь процентов) от конечной цены предмета торгов.**
Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен подписать с Продавцом договор купли-продажи предмета торгов после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона в течение 10 (десяти) рабочих дней с момента подписания протокола о результатах торгов. Оплата приобретенного предмета торгов должна быть произведена в полном объеме не позднее 5 (пяти) рабочих дней со дня заключения договора.
6. Подробнее с правилами проведения торгов можно ознакомиться в разделе «Ликвидация» на сайте https://orgtorg.by/info/.
7. Все желающие могут предварительно ознакомиться с объектом торгов. **По вопросу осмотра объектов обращаться по телефонам: по лотам №№ 1–51, 54 +375295894134, Ольга Михайловна; по лотам №№ 52, 53 +375293045990, Дарья**
8. Организация и проведение аукциона осуществляются на основании норм Положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16.

Продавец	**Открытое акционерное общество «ТРЕСТ БЕЛСТРОМРЕМОНТ» (ликвидатор – ООО «Партнёр-Консультант», тел.: +375 29 304 59 90, 8017 255 29 28)**
Организатор торгов	**ООО «Фрондера»: ☎ 8 (029) 308 28 97 • e-mail: info.torgi@orgtorg.by • сайт: orgtorg.by • 220113, г. Минск, ул. Мележа, д. 1, офис 1127**

РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ» (Организатор аукциона)

извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего **ОАО «Криница» (Продавец)**

Аукцион состоится **07.12.2023 в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.

Лот № 1: Механический термотрансферный маркиратор Allen Compact в комплекте (инв. № 14552). Начальная цена с НДС 20 % – 1 824,00 руб. Задаток – 182,40 руб.
Лот № 2: Электроталь 0,125 т. (инв. № 3194). Начальная цена с НДС 20 % – 700,80 руб. Задаток – 70,08 руб.
Лот № 3: Поворотное устройство KUA-M-2H (инв. № 10953). Начальная цена с НДС 20 % – 528,00 руб. Задаток – 52,80 руб.
Лот № 4: Измельчитель (инв. № 8033). Начальная цена с НДС 20 % – 31 008,00 руб. Задаток – 3 100,80 руб.
Лот № 5: Стерилизующий фильтр для производства пива (инв. № 366). Начальная цена с НДС 20 % – 297,60 руб. Задаток – 29,76 руб.
Лот № 6: Поворотное устройство KUA-M-2H (инв. № 10952). Начальная цена с НДС 20 % – 528,00 руб. Задаток – 52,80 руб.
Лот № 7: Циклон ЦП-1000 (инв. № 10954). Начальная цена с НДС 20 % – 422,40 руб. Задаток – 42,24 руб.
Лот № 8: Упаковочная машина (инв. № 8098). Начальная цена с НДС 20 % – 110 400,00 руб. Задаток – 5 520,00 руб.
Лот № 9: Линия по производству сухих напитков (инв. № 3084). Начальная цена с НДС 20 % – 47 424,00 руб. Задаток – 4 742,40 руб.
Лот № 10: Инвертер SJ 100 (инв. № 10973). Начальная цена с НДС 20 % – 316,80 руб. Задаток – 31,68 руб.
Лот № 11: Автомат А-5-АРБ-2 фасовочный (инв. № 3095). Начальная цена с НДС 20 % – 3 936,00 руб. Задаток – 396,60 руб.
Лот № 12: Расфасовочный автомат С3/2 (инв. № 3200). Начальная цена с НДС 20 % – 27 648,00 руб. Задаток – 2 764,80 руб.
Лот № 13: Блок фильтрующий аэрозольный (инв. № 484). Начальная цена с НДС 20 % – 278,40 руб. Задаток – 27,84 руб.
Лот № 14: Электроталь г/п 0,125 т (инв. № 8092). Начальная цена с НДС 20 % – 700,80 руб. Задаток – 70,08 руб.
Лот № 15: Механический термотрансферный маркиратор Allen Compact в комплекте (инв. № 14550). Начальная цена с НДС 20 % – 1 824,00 руб. Задаток – 182,40 руб.
Лот № 16: Механический термотрансферный маркиратор Allen Compact в комплекте (инв. № 14551). Начальная цена с НДС 20 % – 1 824,00 руб. Задаток – 182,40 руб.
Лот № 17: Механический термотрансферный маркиратор Allen Compact в комплекте (инв. № 14553). Начальная цена с НДС 20 % – 1 824,00 руб. Задаток – 182,40 руб.

Место нахождения Лотов №№ 1–17: г. Минск, ул. Радиальная, 52 (территория ОАО «Криница»).

Шаг аукциона – 5 %. Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте Организатора аукциона – ino.by.
Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X.
Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Окончание приема заявлений и задатка – **05.12.2023 в 11.00.**

Организатор аукциона: 220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9, 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by

УНП 190055182

РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ» (Организатор аукциона)

извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего **ОАО «Криница»**

Аукцион состоится **06.12.2023 в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.

Лот № 1: Разбраживающий танк (складской № 70568.2). Начальная цена с НДС 20 % – 2 304,00 руб. Задаток – 50,00 руб.
Лот № 2: Емкость из н/ж стали 30 ГЛ (КВ) (складской № 70575.2). Начальная цена с НДС 20 % – 4 128,00 руб. Задаток – 50,00 руб.
Лот № 3: Разбраживающий танк 1,2 к. м н/ж (КВ) (складской № 70577.3). Начальная цена с НДС 20 % – 2 304,00 руб. Задаток – 50,00 руб.
Лот № 4: Разбраживающий танк 1,2 к. м н/ж (складской № 70577.4). Начальная цена с НДС 20 % – 2 304,00 руб. Задаток – 50,00 руб.

Место нахождения Лотов № 1 – 4:
г. Минск, ул. Радиальная, 52 (территория ОАО «Криница»).
Шаг аукциона – 5 %.

Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте Организатора аукциона – ino.by. Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.
Окончание приема заявлений и задатка – **04.12.2023 в 11.00.**

☎ Организатор аукциона:
220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9, 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by

УНП 190055182

СЛУХАЦЬ РЫЭЛТАРА І НЕ ПАДМАНУЦЦА

АПЛАЧВАЦЬ ДВОЙЧЫ АДНУ ПАСЛУГУ ЗАБАРОНЕНА

Міністэрства юстыцыі як рэгулятар узаемаадносін на рынку нерухомасці канстатуе негатыўнае стаўленне насельніцтва да сферы рыэлтарскіх паслуг. І такое становішча склалася ў выніку дзейнасці самой рыэлтарскай суполкі, паведаміла **Дзіяна ПАДЛЕСКАЯ, начальнік упраўлення адвакатуры і ліцэнзавання юрыдычнай дзейнасці Міністэрства юстыцыі:**

— Згодна са статыстыкай, адна з самых галоўных праблем — прымушэнне пакупнікоў да несправядлівай аплаты рыэлтарскіх паслуг. Падрыхтаваныя Мінюстам змены ў заканадаўства скіраваны ў тым ліку і на купіраванне гэтай праблемы. Пастанова Саўміна № 754 утрымлівае норму пра тое, што ***аплата адной і той жа рыэлтарскай паслугі (якая аказваецца ў дачыненні да аднаго і таго ж аб'екта нерухомасці) абодвума бакамі здзелкі з гэтым аб'ектам, якія ў сваю чаргу з'яўляюцца спажыўцамі паслуг рыэлтарскай арганізацыі, недапушчальная.*** *Абазначаная норма скіравана на забеспячэнне яснасці прадпісанняў асноватворнага для рыэлтараў нарматыўна-прававога акта — Правіл ажыццяўлення рыэлтарскай дзейнасці, якія зацверджаны Указам Прэзідэнта ад 9 студзеня 2006 года № 15.*

Нормамі Указа № 15 вызначана, што **прадавец, які заключае з рыэлтарскай арганізацыяй дагавор на продаж кватэры ці іншага суб'екта нерухомасці, аплачвае ўвесь комплекс рыэлтарскіх паслуг: ад кансультацыі да афармлення здзелкі.** Такім чынам, калі рыэлтарская арганізацыя прапануе да продажу аб'ект нерухомасці, значыць, у яе заключаны такі комплексны дагавор з прадаўцом, што ў сваю чаргу азначае: **браць аплату за аналагічныя паслугі з пакупніка рэыалтарская арганізацыя не ў праве,** удакладніла прадстаўніца Мінюсту:

— Тым не менш асобныя рыэлтарскія арганізацыі ігнаруюць патрабаванні Правіл, спасылаючыся нібыта на няяснасць заканадаўства, і патрабуюць заключэння такога ж дагавора і ад пакупніка, з якога таксама бяруць плату за паслугі.

Такім чынам, **заявы агенцтва, што за паслугу здзелкі з нерухомасцю павінен заплаціць і прадавец (за продаж), і пакупнік (за пакупку), — міф.**

НЕ АПЛАЦІШ — НЕ ПРАВЕРЫМ?

Асобныя рыэлтарскія арганізацыі займаюцца неправамернымі тлумачэннямі аб тым, што **ў рамках дагавора на аказанне рыэлтарскіх паслуг, які заключаны з прадаўцом, юрыдычная чысціна здзелкі не правяраецца, і інфармацыя пра магчымыя абмежаванні ў дачыненні да аб'екта будзе праверана толькі ў выпадку аплаты пакупніком паслуг рыэлтарскай арганізацыі. Гэта міф.**

Заканадаўствам прама прадугледжана, што рыэлтарская арганізацыя абавязана перашкаджаць сведчанню і дзяржрэгістрацыі здзелкі, якая можа быць прызнана нядзейснай, паведаміла Дзіяна Падлеская:

— Для забеспячэння адпаведнасці здзелкі заканадаўству рыэлтарская арганізацыя мае права атрымліваць інфармацыю ад дзяржорганаў і іншых арганізацый аб аб'ектах нерухомасці, аб правах на іх, аб юрыдычных і фізічных асобах (баках здзелкі), адносна якой ажыццяўляецца рыэлтарская дзейнасць. Такім чынам, ***у рамках заключанага з прадаўцом дагавора рыэлтарская арганізацыя абавязана прымаць усе меры да выяўлення любых абмежаванняў у дачыненні да аб'екта нерухомасці,*** *які прадаецца, і гэта з'яўляецца абаронай пакупніка.*

З гэтай прычыны кватэра, якая прапануецца да продажу агенцтвам, павінна быць прыярытэтным варыянтам пры выбары пакупніком, паколькі з ёй апрыёры не павінна быць праблем, падкрэсліла спецыяліст.

АБГРУНТУЙ СВАЕ ТАРЫФЫ!

Доўгачаканай зменай для рыэлтараў стала **адмена тарыфаў на рыэлтарскія паслугі, звязаныя з камерцыйнай нерухомасцю, аб'ектамі нежылога фонду, а таксама на рыэлтарскія паслугі, што аказваюцца юрыдычным асобам.**

— Мера мэтазгодная, паколькі камерцыйныя аб'екты павінны абарачацца на ўмовах прадпрымальніцкай дзейнасці. Новаўвядзенне таксама будзе садзейнічаць развіццю канкурэнцыі на рынку рыэлтарскіх паслуг і, як вынік, павышэнню якасці іх аказання, — патлумачыла Дзіяна Падлеская. *— Рэгуляванне тарыфаў для фізічных асоб на рыэлтарскія паслугі ў дачыненні да жылых памяшканняў, зямельных участкаў, дач, садовых домікаў, гарадоў і машына-месцаў захоўваецца, аднак у гранічных значэннях.*

Рыэлтарскія канторы змогуць самі вызначаць кошт паслуг і даваць зніжкі, што ў выніку зробіць такія паслугі больш прывабнымі для людзей, а спажывец такім чынам будзе абаронены ад неабгрунтаванага росту цаны. Пры гэтым **памер вызначаных рыэлтарскімі арганізацыямі тарыфаў яны павінны будуць абгрунтаваць.**

НЕ ТОЛЬКІ АДРАС, АЛЕ І ПАДБОР ВАРЫЯНТА

Пастановай **зменены правілы работы рыэлтарскіх арганізацый у сферы аказання паслуг па найме жылых памяшканняў,** што асабліва актуальна ў летне-асенні перыяд, калі студэнты прыязджаюць у сталіцу ці буйныя гарады ў пошуках здымнага жылля, расказала спецыяліст:

— Да новаўвядзення спажывец, які звяртаўся ў рыэлтарскую арганізацыю па дапамогу ў пошуку жылля, мог заключыць дагавор на аказанне паслуг толькі па прадастаўленні пісьмовай інфармацыі аб попыце і прапановах на такія аб'екты. У выніку асобныя арганізацыі выконвалі свае абавязкі нядобрасумленна. ***Раней заключаўся дагавор на аказанне паслуг па прадастаўленні інфармацыі, у якасці якой спажывец атрымліваў адрасы аб'ектаў нерухомасці або нумары тэлефонаў уласнікаў, за што агенцтвы бралі аплату.*** *Аднак часта такія звесткі былі недакладнымі, а каб вярнуць выплачаныя за, па сутнасці, неаказаную паслугу грошы, трэба было прыкласці нямала сіл і часу.*

Са спажыўцом, які шукае жыллё, **цяпер заключаецца дагавор на аказанне рыэлтарскіх паслуг па прадастаўленні інфармацыі аб попыце і прапановах, а таксама падборы варыянтаў здзелкі з аб'ектам нерухомасці па найме жылля. Аплата такіх паслуг (сёння — пяць базавых велічынь, і гэта гранічная велічыня) адбываецца толькі па факце падбору аб'екта,** які адпавядае ўмовам дагавору, і падпісання бакамі акта аказаных паслуг, дзе ўказваецца інфармацыя пра падабраны аб'ект.

Прадстаўніца Мінюста выказала надзею, што ўнесеныя змены прагрэсіўныя і дапамогуць палегчыць абарону правоў спажыўцоў і павысіць прывабнасць рыэлтарскіх паслуг. Яна запрасіла ўсіх зацікаўленых уносіць прапановы ў законапраект па ўдасканаленні рыэлтарскай дзейнасці, падрыхтоўка якога запланавана на 2024 год.

— Якім бы добрым ні быў нарматыўны акт, пытанні якасці аказання паслуг і, як вынік, запатрабаванасці іх насельніцтвам могуць і павінны вырашацца самой рыэлтарскай суполкай. Неабходна так выбудоўваць работу, каб грамадзяне бачылі карысць ад удзелу рыэлтарскай арганізацыі, а не вымушана аплачвалі паслугі, часам не ведаючы нават за што.

Дзіяна Падлеская нагадала, што дзеянні, скіраваныя на прымус аплаты, бесперспектыўныя і не садзейнічаюць паляпшэнню рэпутацыі агенцтваў. За такія дзеянні да адказнасці будуць прыцягвацца не толькі асобы, якія непасрэдна аказваюць паслугі, але і кіраўнікі рыэлтарскіх арганізацый, якія не забяспечылі вытрымліванне работнікамі заканадаўства.

Ірына СІДАРОК.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Результаты проведения РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ

«Раскрути Cabandos на призы»

Сведения о рекламной игре:
Наименование рекламной игры: «Раскрути Cabandos на призы».
Территория проведения: Республика Беларусь.
Период проведения: с 01 августа 2023 года по 29 декабря 2023 года.
В рекламной игре приняли участие 32 404 участника.
Призовой фонд рекламной игры разыгран полностью.

Победителями стали

№	Наименование приза	Кол-во, шт.	ФИО победителя
1	Денежный приз 50 белорусских рублей	30	Гурчунова Татьяна Александровна
			Заяц Артём Владимирович
			Матвеев Егор Русланович
			Балашенко Александра Дмитриевна
			Булаткин Дмитрий Алексеевич
			Пашко Галина Александровна
			Нарейко Наташа Ивановна
			Шалак Ирина Александровна
			Лосева Ольга Николаевна
			Дюбанова Екатерина Васильевна
			Лебедич Илья Дмитриевеч
			Калитеня Олег Васильевич
			Воронович Дмитрий Александрович
			Якимович Владислав Николаевич
			Клятченко Екатерина Дмитриевна
			Савко Карина Константиновна
			Мяделец Елена Николаевна
			Железнова Юлия Викторовна
			Новик Светлана Борисовна
			Проценко Ирина Николаевна
			Супринович Андрей Эдуардович
			Шалуха Сергей Юрьевич
			Серафимович Дмитрий Васильевич
			Тимофеев Евгений Андреевич
			Валуевич Алёна Степановна
			Гузевич Альберт Юрьевич
			Бондарь Виктория Владимировна
			Шанкарёв Павел Сергеевич
			Купранович Ольга Юрьевна
			Кузьма Дмитрий Леонидович
2	Портативная беспроводная колонка Canyon CNE-CBTSP4R	10	Мущинка Диана Игоревна
			Володькин Глеб Сергеевич
			Дмитриева Дана Ивановна
			Васильева Ксения Вадимовна
			Петров Артур Романович
			Дубаневич Юлия Петровна
			Папкова Елена Витальевна
			Родионова Татьяна Ивановна
			Грибок Алексей Михайлович
			Лакиза Инна Анатольевна
3	Портативная колонка Canyon CNE-CBTSP4DG	10	Смальцер Егор Петрович
			Середич Наталья Андреевна
			Говор Валерия Олеговна
			Нестерук Юлия Игоревна
			Козел Дмитрий Александрович
			Осмоловский Алексей Викторович
			Шепелевич Екатерина Владимировна
			Тарайкович Юлия Александровна
			Мекеко Анастасия Антоновна
			Заболотный Павел Александрович
4	Портативная колонка Canyon CNE-CBTSP4BL	10	Мотора Олег Сергеевич
			Тихончук Андрей Сергеевич
			Клещук Евгений Андреевич
			Анискевич Антон Витальевич
			Красевич Артур Сергеевич
			Хомко Илона Андреевна
			Даниленко Татьяна Александровна
			Осипенко Андрей Николаевич
			Михалькевич Инна Александровна
			Ваганов Александр Владленович
5	Денежный приз 100 белорусских рублей	6	Плотникова Светлана Владимировна
			Суровец Анастасия Алексеевна
			Коноплицкая Карина Дмитриевна
			Ковалевич Дмитрий Вадимович
			Гриневич Анна Сергеевна
			Чубаев Станислав Александрович
6	Беспроводные наушники HONOR Choice Moecen Earbuds X3 Lite	6	Балалаев Роман Денисович
			Костюкович Надежда Викторовна
			Чайковский Кирилл Михайлович
			Потеева Злата Александровна
			Дедуль Вадим Иванович
			Кривенцева Дарья Геннадьевна
7	Денежный приз 300 белорусских рублей и денежные средства в размере 17,03 белорусских рублей	6	Старовойтова Елена Францевна
			Силивончик Екатерина Станиславовна
			Кузьмицкая Екатерина Александровна
			Андрончик Ольга Сергеевна
			Кейко Инесса Валерьевна
			Валькович Мария Владимировна
8	Яндекс.Станция Мини без часов YNDX-00021B (синий) и денежные средства в размере 7,93 белорусских рублей	3	Римша Игорь Сергеевич
			Романович Людмила Геннадьевна
			Якуба Светлана Андреевна
9	Умная колонка Яндекс Станция Новая Мини YNDX-00021K (черный) и денежные средства в размере 8,97 белорусских рублей	3	Окулич Анастасия Ивановна
			Якимуш Сергей Николаевич
			Алехнович Николай Константинович
10	Денежный приз 1000 белорусских рублей и денежные средства в размере 121,63 белорусских рублей	4	Дюбкин Сергей Николаевич
			Калинина Ольга Александровна
			Фунт Вероника Петровна
			Курилович Алексей Владимирович
11	Телефон Xiaomi Redmi Note 12 Pro 4G 8GB/256GB и денежные средства в размере 133,29 белорусских рублей	4	Островский Влад Александрович
			Островский Влад Александрович
			Олешкевич Екатерина Михайловна
			Механиков Виталий Николаевич
12	Денежный приз 2000 белорусских рублей и денежные средства в размере 271,06 белорусских рублей	2	Кобыльник Илья Владимирович
			Коваленко Максим Васильевич
13	Денежный приз 3000 белорусских рублей и денежные средства в размере 420,48 белорусских рублей	2	Ермолаев Алексей Игоревич
			Решилова Ирина Сергеевна
14	Ноутбук Lenovo IdeaPad 3 15ITL05 (81X80067RE) и денежные средства в размере 262,10 белорусских рублей	2	Хорошун Анастасия Юрьевна
			Жуковская Светлана Леонидовна
15	Телевизор LG 50QNED816RA и денежные средства в размере 420,48 белорусских рублей	2	Дысь Елена Марьяновна
			Готовчик Алексей Николаевич
16	Главный приз 10 000 белорусских рублей и денежные средства в размере 1 466,46 белорусских рублей	1	ЯКИМОВИЧ Дмитрий Иосифович

Организатором рекламной игры является ООО «ТДИ ПРОМОИВЕНТ», Республика Беларусь, 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, 21/5-1, УНП 190771520. Свидетельство о государственной регистрации рекламной игры № 4337 от 17.07.2023, выданное Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь.

Телефон для справок по вопросам проведения рекламной игры +375 17 388 78 89 ежедневно с 09.00 до 21.00, сайт cabandos.by.

Правила рекламной игры опубликованы в газете «Звязда» № 145 от 29.07.2023.

«ГЭТА ЗАЎСЁДЫ СВЯТА»

Як адкрыўся XXIX Мінскі міжнародны кінафестываль «Лістапад»

Зоркі кінематографа ў стыльных строях, чырвоная дарожка, ззянне вачэй, усмешкі і фільм, фільм, фільм... Аб чым гэта мы? Канешне, аб старце XXIX Мінскага міжнароднага кінафестывалю «Лістапад».

Сёлета адкрыццё было ўнікальным, бо праходзіла адначасова 17 лістапада больш як у 80 кінатэатрах краіны. Аднак асноўная цырымонія адгрымела ў сталічным Доме кіно. Менавіта яе і наведала «Звязда».

Намеснік прэм'ер-міністра Ігар ПЕТРЫШЭНКА ўручае спецыяльную прэмію Прэзідэнта народнаму артысту Беларусі Аляксандру ЯФРЭМАВУ.

Столькі зорак кіно, што аж вочы разбягаюцца, усе такія радасныя, прыгожыя. Нашу ўвагу прыцягнула актрыса Алена Дуброўская. Яе першы фестываль быў больш за 15 гадоў таму. На той момант яна толькі скончыла Акадэмію мастацтваў і пачала сваю службу ў тэатры.

— Тады фестываль праходзіў у Палацы Рэспублікі. Для мяне гэта была нейкая знамянальная падзея. Я памятаю пачуцці, калі выбірала ўбор на свой першы «Лістапад», — дзеліцца актрыса. — Фестываль — гэта заўсёды свята. Выдатная нагода сустрэцца з калегамі, абмяняцца поспехамі. І наогул гэта цудоўная падзея. Нягай ён жыве вельмі доўга!

Пагаварылі мы і з Вячаславам Нікіфаравым, які сёлета ўваходзіць у склад журы. Ён заявіў, што будзе ацэньваць строга ў адпаведнасці з досведам і густам.

— Хачу ўбачыць сапраўднае кіно. Такое, у якім усё відавочна, зразумела, проста, але ў той жа час неверагодна. Гэта падобна таму водгуку, які нараджае ў нас паэзія, — тлумачыць рэжысёр.

Сёлета кінафестываль адкрыўся прэм'ерным паказам фільма Кірыла Халецкага «Кіношнікі». Дарэчы, гэта дэбют рэжысёра ў поўным метры.

— Хацелася б больш паглыбіць гледача ў атмасферу кіношнасці. У фільме вельмі шмат тэрмінаў прафесійных, нейкага жаргону кіношнага і гумару. Глядач лепш зразумее, як працуе кіно, убачыць кінастудыю знутры, — распавядае рэжысёр.

Таксама ён заявіў, што гатовы да любых водгукаў, нават да самай суровай крытыкі:

— Я заўсёды кажу маладым рэжысёрам, што няўдача — рух наперад, таму што гэта ўсё роўна спроба. І тут самае галоўнае — не здавацца. Чаго я і жадаю свайму галоўнаму герою ў фільме. Трэба працаваць над сабой, аналізаваць свае памылкі, і ўсё будзе добра.

Хутка надышоў час афіцыйнай часткі кінафестывалю, якая абяцала раскрыць галоўную інтрыгу вечара: хто ж атрымае спецыяльную прэмію Прэзідэнта «За захаванне і развіццё духоўнасці ў мастацтве». На цырымоніі віцэ-прэм'ер Ігар Петрышэнка зачытаў прывітанне ад імя кіраўніка дзяржавы.

— Беларусь на некалькі святочных дзён аб'яднае цэлую плеяду зорных і зусім маладых кінематаграфістаў, чыё мастацтва заснавана на высокіх ідэалах праўды і дабра — якасцях, якімі па праве славіцца наша дзяржава, — гаворыцца ў пасланні. — Упэўнены, што сёлетняе мерапрыемства пад дэвізам «Ствараем будучыню» падорыць шмат станоўчых эмоцый прыхільнікам сучаснага кінематографа і стане магутным стымулам для далейшай папулярызацыі ідэй міру і прыязнасці.

Пасля гэтага спецыяльную прэмію Прэзідэнта ўручылі народнаму артысту Беларусі Аляксандру Яфрэмаву.

— Я бязмерна ўдзячны за гэты прыз. Гэта вялікі гонар і вялікая адказнасць, я гэта ўсведамляю, — заявіў артыст. — Наш фестываль калісьці пачынаўся з удзелу з боку Прэзідэнта, і яго ўвага да гэтага мерапрыемства пастаянная. Спадзяюся, што мы справімся, і гэта будзе чарговы годны «Лістапад».

Канцэртная праграма таксама была на ўзроўні. Нумары ўражвалі сваёй прадуманасцю і музычнасцю. Варта адзначыць таксама, што сёлета на сцэне «Лістапада» ўпершыню выступіў Прэзідэнцкі аркестр Рэспублікі Беларусь.

Канешне, не абышлося і без яшчэ адной значнай традыцыі фестывалю. Аляксандр Яфрэмаў урачыста разбіў талерку з лагатыпам «Лістапада» аб штатыў камеры. Пасля гэтага рытуалу кінафестываль афіцыйна адкрыўся.

Напярадзе цэлы тыдзень, напоўнены кіно на любы густ: афіша «Лістапада» ўключае каля 80 карцін розных жанраў. Традыцыйна конкурсныя паказы пройдуць у кінатэатрах «Піянер», «Цэнтральны» і «Беларусь».

Лізавета ГОЛАД,
фота аўтара.

ЛЕПШ «БУСЕЛ» У РУКАХ

Нацыянальная тэатральная прэмія абрала сваіх пераможцаў

Вынікі VII Рэспубліканскага конкурсу тэатральнага мастацтва «Нацыянальная тэатральная прэмія» былі падведзены на сцэне Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы 18 лістапада.

Самая знакавая тэатральная падзея Беларусі на працягу трох тыдняў радавала гледачоў найлепшымі спектаклямі з 20 тэатраў краіны. І ўвесь гэты час, вядома, усіх хвалявала пытанне: хто ж атрымае запаветнага «Бусла».

У дзень падвядзення вынікаў у Купалаўскім тэатры было шматлюдна. Найлепшыя прадстаўнікі тэатральнай грамадскасці сабраліся ў зале. На самым пачатку вядучыя звярнуліся да гісторыі конкурсу.

— 12 гадоў таму на сцэне Вялікага тэатра Беларусі былі абвешчаны першыя лаўрэаты галоўнай тэатральнай прэміі краіны. У параўнанні з першымі конкурсамі змянілася ўсё: ад складу намінацый да выявы галоўнай узнагароды. Нязменным засталося бескампрамісснае спаборніцтва прафесіяналаў, — абвясцілі яны.

Значнасць гэтай падзеі ў сваёй прамове таксама падкрэсліў **першы намеснік міністра культуры Валерый ГРАМАДА**:

— Вельмі важна тое, што наша тэатральная грамадскасць можа ўбачыць найлепшыя работы рэгіянальных тэатраў.

Таксама ён дадаў, што тэатральная прэмія сваім узроўнем устанаўлівае новыя творчыя арыенціры на найбліжэйшыя два гады.

Сама ж цырымонія была проста неверагодна яркай. Феерыя, якая спалучала ў сабе эпізоды разнастайных спектакляў, апладысменты, уручэнне ўзнагарод, слёзы шчасця і шмат добрых слоў.

Дык хто ж атрымаў прафесійнае прызнанне і тую самую статуэтку «Бусла»? Па выніках конкурсу, у намінацыі «Спектакль для дзяцей і юнацтва» перамагла опера Вялікага тэатра Беларусі «Гісторыя Кая і Герды (Снежная каралева)». Найлепшым спектаклем тэатра лялек стала пастаноўка «Запіскі юнага ўрача» Беларускага дзяржаўнага тэатра лялек. У намінацыі «Найлепшы спектакль у жанры аперэты, музычная камедыя, мюзікл» перамагла рок-опера «Граф Монтэ-Крыста» Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Максіма Горкага.

Прызы за найлепшы оперны спектакль і найлепшы балетны спектакль былі аддадзены пастаноўкам «Дзікае паляванне караля Стаха» і «Дон Кіхот» Вялікага тэатра Беларусі. А найлепшым спектаклем тэатра драмы для вялікай сцэны стаў «Ідыёт» Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Максіма Горкага.

Акрамя таго, на цырымоніі ўзнагароджання была ўручана Спецыяльная прэмія за ўклад у развіццё тэатральнага мастацтва Беларусі. Яе ўдастоіўся мастацкі кіраўнік Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага музычнага тэатра Адам Мурзіч.

Лізавета ГОЛАД,
фота аўтара.

МЯДЗВЕДЗЬ — НЕ ПЛЮШАВАЯ ЦАЦКА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Ігар Шуневіч паведаміў, што сёння колькасць мядзведзяў імкліва павялічваецца. Іх ужо больш за 700 асобін, хаця яшчэ 20 гадоў таму было 150. «Наша задача — атрымаць дакладнае разуменне ад нашай навуковай грамадскасці, якая аптымальная колькасць мядзведзя павінна быць на нашай тэрыторыі, якая дазволіла б нам адкрываць на яго паляванне. Паколькі гэтая аптымальная колькасць сёння не выведзена, мы кажам: давайце будзем рэгуляваць колькасць там, дзе яго вельмі шмат, залішне шмат, дзе ён замінае жыць», — сказаў старшыня БТПР.

Карацей, зразумела, што самы буйны драпежнік адчувае сябе дастаткова камфортна ў нашых лясах, і, цалкам чакана, неўзабаве таўстапятых будзе ўсё больш і больш. Адпаведна, нам неабходна выбудоўваць так свае ўзаемаадносіны, каб выконваліся інтарэсы абодвух бакоў.

Імя расійскага навукоўца Валянціна Сяргеевіча Пажэтнава ў біялагічным свеце ведаюць усе. Гэты «мядзведжы тата» распрацаваў аўтарскую методыку, якая дазваляе выгадаваць асірацелых мядзведзікаў і вярнуць іх у месцы натуральнага пасялення. Яго шматгадовыя назіранні і непасрэдная праца з жывёламі — бясцэнны вопыт, прызнаны многімі спецыялістамі ў свеце. Некалькі гадоў таму мне пашанцавала пазнаёміцца з Валянцінам

Сяргеевічам, і ён запрасіў мяне ў госці ў Цвярскую вобласць, у арганізаваны ім Цэнтр выратавання медзведзянят-сірот. Мы сядзелі дапазна за сталом і абмяркоўвалі многія тэмы. Адна з іх — ці можна пасябраваць з мядзведзем? Думаю, меркаванне Валянціна Пажэтнава будзе цікава і нашым чытачам.

КАБ ВЫРАТАВАЦЬ АВЁС, ДАСТАТКОВА БЫЛО АБЫСЦІ ПОЛЕ БАСАНОЖ

— Ніякай размовы са мной адносна «мірнага суіснавання» чалавека і мядзведзя быць не можа. Як біёлаг я разумею, што мядзведзь, тыгр, леў, воўк ці іншы драпежнік ёсць і назаўжды застануцца антаганістамі чалавеку, да сканчэння іх існавання на Зямлі як відаў. Іншая справа, задача чалавека — захаваць і забяспечыць існаванне максімальнай біялагічнай разнастайнасці на нашай планеце. Але гэта не азначае, што, прыкрываючыся «жывёлалюбствам», трэба выпускаць сітуацыю з-пад кантролю. Асабліва калі гаворка заходзіць аб такіх буйных драпежніках, як мядзведзі.

Верагодна, калі чалавецтва дажыве да таго часу, калі зможа дыстанцыйна ці яшчэ неяк рэгуляваць рэпрадуктыўную функцыю ў дзікіх жывёл, то праблема з «перанасяленнем» знікне. Але пакуль у аглядную будучыні, на мой погляд, паляванне — адзіны разумны спосаб рэгулявання колькасці. Зрэшты, не варта забываць і аб тым, што праблема «чалавек — мядзведзь» не абмяжоўваецца толькі адным аспектам колькасці.

Мядзведзь — драпежнік, і ў пэўных абставінах чалавек для яго ўсяго толькі ежа. Вінаваціць яго нельга — гэта прырода. А вось зрабіць так, каб у наш час нават пры выпадковых сустрэчах мядзведзь баяўся звязвацца з чалавекам, думаю, можна і неабходна. І гаворка ў дадзеным выпадку ідзе аб паляванні, дакладней аб тым, які ўплыў яно аказвае на абаронча-ахоўныя паводзіны (паводніцкія рэакцыі) бурага мядзведзя. Я перакананы, што ў звера павінен быць ярка выяўлены і захоўвацца ў часе страх перад чалавекам.

Для пачатку варта нагадаць, што паляванне на бурага мядзведзя існуе з глыбокай старажытнасці. Паляўнічыя пастаянна абходзілі месцы залягання, выходзілі на мядзведзя з сабакамі, падымалі яго з бярлогі. Гэтыя дзеянні спрыялі фарміраванню ўстойлівага пачуцця трывогі і небяспекі ў звера. За стагоддзі ў філагенезе ў бурага мядзведзя сфарміравалася, напрыклад, рэакцыя пазбягання бярлогі, калі ў ёй звера патрывожыў чалавек, — жывёла туды ўжо не вяртаецца.

Страх — асноўны фактар, які ўтрымлівае від на адлегласці, бяспечнай для чалавека пры сустрэчах. Ён замацаваўся на відавым узроўні і падтрымліваўся ў часе менавіта праз паляванне. Страх аказаўся настолькі моцна выяўленым, што ў недалёкім мінулым на загонных паляваннях нават выкарыстоўвалі сцяжкі з пахам чалавека, аналагічна акладу ваўкоў, каб накіраваць паднятага з бярлогі мядзведзя на лінію стралкоў. А каб выратаваць авёс ад патравы мядзведзем, дастаткова было селяніну двойчы за ноч абысці поле басанож. Таксама пасевы паспяхова захоўвала раскладзенае ўздоўж поля старое адзенне і абцягванне пяньковым шнуром па перыметры. З часам сітуацыя змянілася, і цяпер падобныя захады звера ўжо не палохаюць.

ФАКТАР ТРЫВОГІ РАТУЕ ПАПУЛЯЦЫЮ

— Але неабходна разумець: рэакцыя пазбягання бурым мядзведзем чалавека — найважнейшы фактар, які вызначае ў сістэме ўзаемаадносін гэтых відаў сумесны дабрабыт. Пры зніжэнні ўзроўню страху перад чалавекам дыстанцыя ўцёкаў у мядзведзяў скарачаецца. Апроч прамых сутыкненняў, маюць месца заходы звяроў у населеныя пункты, спусташэнне імі сельскіх падворкаў. У выніку канфлікты непазбежныя, паступова сфарміруецца і ўстойлівае негатыўнае стаўленне людзей да мядзведзяў. А гэта няправільна.

Жадаў бы звярнуць увагу на з'яву, якая існуе ў дзікай прыродзе, але застаецца практычна «тэра інкогніта» для навукоўцаў. Гэта назапашванне, захоўванне, перадача і выкарыстанне жывёламі інфармацыі. Менавіта інфармацыя (генетычны патэнцыял і навучанне) спрыяе найболей аптымальнаму падтрыманню жыццяздольнасці любой папуляцыі, у часавым аспекце яе фарміравання і змены.

Мне не раз даводзілася чуць аргумент ад «звераабаронцаў», маўляў, паляўнічы-кат забіў мядзведзя. Якую ж інфармацыю мёртвы звер можа пакінуць у папуляцыі аб небяспецы з боку чалавека? Што і як ён можа «расказаць» іншым, пакінутым у жывых мядзведзям? І няўцям такім заяўнікам, што ў мядзведзяў, як і іншых звяроў, ёсць свая мова.

Варта разумець, што кожны від мае свой характэрны пах: коні пахнуць канямі, сабакі — сабакамі, а людзі — людзьмі. На месцы здабычы застаюцца сляды, якія змяшчаюць асаблівую інфармацыю аб гібелі звера, і калі гэта было паляванне, то і аб паляўнічых — людзях з іх краявідным пахам. Гэта найважнейшы матэрыял для жывёл як здабытага віду, так і для іншых, якія насяляюць навакольле. Інфармацыя пра тое, што адбылося, адбіваецца ў іх памяці і выклікае рэакцыю пазбягаць чалавека як крыніцы пагрозы.

І яшчэ, мядзведзь, як і любы іншы буйны звер, у сілу значнай біялагічнай масы — цэнтр увагі на тэрыторыі свайго пасялення. Ад яго месцазнаходжання і стану залежаць міжвідавыя сацыяльныя ўзаемасувязі ў дадзеных угоддзях. Прыбярыце мядзведзя — фактар трывогі, і памяняюцца рэакцыі ў пакінутых жывёл у арыенціровачных і арыенціровачна-абарончых паводзінах. Трывога ў дадзеным кантэксце — гэта тое, што мы завём насцярожанасцю. Пакуль ёсць фактары трывогі, падтрымліваецца насцярожанасць. Пры гэтым фарміруецца ланцужок захавання ў часе рэакцыі пазбягання фактару трывогі, якая забяспечвае жыццяздольнасць папуляцыі. Такім вось чынам і «перадаюць» здабытыя мядзведзі інфармацыю аб неабходнасці пазбягаць чалавека суродзічам, якія застаюцца, што карысна як для саміх мядзведзяў, так і для людзей, якія жывуць побач.

Мядзведзь — звер разумны, моцны і вельмі ўпарты ў захаванні сваёй прысутнасці на тэрыторыі. Праз маладых звяроў гэты від заўсёды будзе спрабаваць магчымасць засваення новых месцаў. Зніжэнне страху, скарачэнне «дыстанцыі ўцёкаў» у мядзведзя ў адносінах да чалавека вядзе да немінучага павышэння з часам колькасці канфліктаў. Без кантролю і кіравання папуляцыямі, уключаючы прымусовае адабранне (паляванне), пакуль не абысціся. Іншага эфектыўнага на сёння спосабу, акрамя стрэльбы, якая падтрымлівае страх у мядзведзя перад чалавекам, мне невядома.

Андрэй КАРАБЕЛЬНІКАЎ, фота з архіва аўтара.

АД АЎТАРА

Сучасны сусветны досвед паказвае, што праблема суіснавання людзей з буйнымі драпежнікамі вострая і ідэальнага рашэння няма. У натуральным асяроддзі законамі прыроды не прадугледжана сяброўскае сумеснае пражыванне біялагічных відаў, якія прэтэндуюць на адны і тыя ж рэсурсы і тэрыторыі. Але паколькі падчас эвалюцыі чалавек разумны атрымаў вызначаныя перавагі над іншымі прадстаўнікамі нашай фаўны і ўжо значна трансфармаваў навакольнае асяроддзе пад свае патрэбы, жыццёвай неабходнасці пазбаўляцца ад канкурэнтаў-драпежнікаў у яго няма. Больш за тое, усвядоміўшы каштоўнасць кожнай жывой істоты, абсалютная большасць людзей цяпер выступае за захаванне біяразнастайнасці на нашай планеце. Пытанне толькі ў тым, як выканаць інтарэсы чалавека і дзікіх жывёл.

Валянцін Сяргеевіч Пажэтнаў жыў і працаваў у вялізнай па памерах краіне — Расіі. Ва ўмовах бязмежных і часта маланаселеных угоддзяў абмежаваць спробы мядзведзя бліжэй пазнаёміцца з чалавекам, мабыць, сапраўды можна, толькі культывуючы і падтрымліваючы пачуццё страху. Там жа, дзе тэрыторыі нашмат меншыя, а шчыльнасць насельніцтва вышэйшая, гэтага фактару, як паказвае практыка, ужо недастаткова. Больш за тое, у грамадстве расце запыт на экатурызм, і замест пазбягання кантакту з драпежнікамі турысты хочуць убачыць звера ўжывую і як мага бліжэй, што, натуральна, супярэчыць канцэпцыі падтрымкі пачуцця страху перад чалавекам.

Часткова праблема вырашаецца стварэннем розных асабліва ахоўных прыродных тэрыторый (ААПТ) з адпаведным рэжымам аховы і правіламі наведвання. Але эфектыўныя яны (у частцы папярэджання канфліктных сітуацый) толькі ў тым выпадку, калі маюць абгароджаную мяжу, якая прадухіляе выйсце дзікіх звяроў за ўстаноўленыя межы. У Беларусі ААПТ звычайна не маюць ніякіх агароджаў. Звяры карт чытаць не ўмеюць, пазначаных на паперы межаў не ведаюць. Рассяляюцца ж жывёлы, як правіла, калі іх становіцца шмат і патрэбны новыя месцы пасялення. Вось яны і выходзяць за межы ААПТ, на тэрыторыі, якія ўжо даўно асвоены людзьмі і выкарыстоўваюцца імі ў сваіх інтарэсах. І тут узнікаюць канфлікты. Калі гаворка ідзе пра малаважную матэрыяльную шкоду, цалкам разумна пераняць досвед некаторых краін і прадугледзець страхавыя выплаты. Але калі ўзнікае рэальная пагроза жыццю і здароўю людзей, неабходна вызначацца, што ж важней — паўсюднае пасяленне такога драпежніка, як буры мядзведзь, ці жыццё чалавека. Пры гэтым сцвярджаць, што паляванне як крыніца страху ўратуе сітуацыю, я б не стаў. Няпалоханыя маладыя мядзведзі з запаведніка не ведаюць пачуцця страху. Паляванне можа выступаць толькі ў ролі рэгулятара колькасці, і ў гэтай частцы без яго не абысціся. Думаю, што развіццё сеткі ААПТ, але з больш жорсткімі правіламі наведвання і эфектыўнымі межамі ў адносінах да такога звера, як мядзведзь, — найбольш прымальны варыянт для краіны.

Надвор'е

ПОЗНЯЯ ВОСЕНЬ УДАРЫЦЬ МАРАЗАМІ

У сераду і чацвер рэзка пахаладае — пры праясненнях да мінус 15 градусаў

Трэцяя дэкада лістапада прынесла нам халодныя паветраныя масы паўночных шырот. А значыць, мы ўступілі ў пару перадзімʼя. Паводле апошніх звестак, сярэднясутачная тэмпература паветра па краіне знаходзіцца ў межах ад мінус 7 градусаў да плюс 1 градуса, што на 1—8 градусаў ніжэй за кліматычную норму. Вось таму на гэтым тыдні дарожнікам давядзецца змагацца з суцэльнай галалёдзіцай, а ў другой палове тыдня мы чакаем моцныя снегапады, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

Зімовы характар надвор'я захаваецца ў нашай краіне ў першай палове гэтага тыдня. У сераду будзе пераважна без ападкаў. На асобных участках дарог галалёдзіца. Уначы паветра астудзіцца да мінус 5—11 градусаў, пры праясненнях — да мінус 15 градусаў. Днём прагназуецца мінус 1—7 градусаў.

Паводле інфармацыі сіноптыкаў, у другой палове тыдня сітуацыя пачне мяняцца. На змену халодным арктычным вятрам прыйдзе цёплая паветраная маса атлантычнага паходжання.

У чацвер чакаецца даволі складанае надвор'е. **Увага! Раніцай і днём месцамі па паўночным усходзе прагназуецца моцны снег і моцны мокры снег.** У асобных раёнах чакаецца завіруха, наліпанне мокрага снегу, на дарогах галалёдзіца, днём па захадзе слабы галалёд. Вецер узмоцніцца да 15—20 м/с. Тэмпература паветра ўначы будзе вагацца ад мінус 5 да мінус 11 градусаў, пры праясненнях — да мінус 15 градусаў, а днём — ад мінус 3 градусаў па ўсходзе да плюс 5 градусаў па захадзе краіны.

У пятніцу злёгку адпусціць, але будзе таксама ветрана і мокра. Ноччу на большай частцы, днём месцамі парывы ветру дасягнуць 15—20 м/с. Тэмпература паветра на працягу сутак будзе вагацца ад мінус 2 да плюс 4 градусаў, а ноччу па ўсходзе краіны — да мінус 4 градусаў. Днём па паўднёвым захадзе чакаецца да 7 цяпла.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у гэтыя выхадныя характар надвор'я ў Беларусі па-ранейшаму будзе няўстойлівы. У суботу часам чакаюцца ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу. Месцамі слабыя туман і галалёд, на асобных участках дарог галалёдзіца. Уначы будзе ад мінус 4 да плюс 3 градусаў, а ўдзень — ад мінус 2 да плюс 5 градусаў.

Халодна і слізка пад нагамі (а часам — проста невыносна) будзе ў нядзелю. У гэты дзень месцамі будзе ісці снег і мокры снег. На дарогах месцамі ўтворыцца галалёдзіца. Уначы слупкі тэрмометра пакажуць ад нуля да мінус 7 градусаў, а пры праясненнях — да мінус 10 градусаў. Днём сіноптыкі абяцаюць ад мінус 5 градусаў да 2 цяпла. Усё, добрае надвор'е скончылася. Цяпер чакаем вясны.

Сяргей КУРКАЧ.

О реализации имущества ООО «Логцентр»

Торги по реализации имущества ООО «Логцентр» (1 лот), назначенные на 15.11.2023 г., признаны несостоявшимися по причине отсутствия заявок

Организатор торгов	ООО «ЛиквидБай», УНП 192290290
Продавец	ООО «Логцентр», УНП 192757823
Форма, дата, время и место проведения торгов	Повторные торги в форме открытого аукциона **01.12.2023 в 12.00** по адресу: **г. Минск, ул. Скрыганова, 6, оф. 911**

Сведения о предмете проведения торгов

Объект недвижимости (одним лотом): капитальное строение с инвентарным номером 600/С-152974 (наименование – Здание склада с АБК, назначение – Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, общая площадь – 5605,3 кв. м, составные части и принадлежности – одно-, двухэтажное смешанной конструкции здание склада с АБК, с водоводом для водоснабжения а1), расположенное на земельных участках с кадастровыми номерами 623687500001000002, 623687500001000006, по адресу: 223039, Республика Беларусь, Минская область, Минский район, Хатежинский с/с, 26, район аг. Хатежино (адрес объекта торгов).

Сведения о земельных участках:

- земельный участок с кадастровым номером 623687500001000002, площадь составляет 0,8599 га;
- земельный участок с кадастровым номером 623687500001000006, площадь – 0,8359 га. Назначение земельных участков – для обслуживания административного здания, складских помещений, котельной и инженерных коммуникаций. Предоставлены Продавцу на праве постоянного пользования.

По вопросу ознакомления с предметом торгов, дополнительной информации обращаться по тел.: 8044 7945248, 8017 3750494

Начальная цена предмета торгов:
Лот № 1 – 3 693 312,71 долларов США с НДС по ставке 20 %

Порядок проведения торгов

Шаг аукциона – 5 %. Победителем торгов признается участник, предложивший наиболее высокую цену. Участникам, не признанным победителями, задаток возвращается в безналичной форме в течение 3 банковских дней с момента утверждения протокола об итогах торгов. Результаты торгов оглашаются публично в день проведения торгов. В случае признания торгов несостоявшимися в связи с подачей заявки на участие в них только одним участником, предмет торгов продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 %

Размер задатка, сроки приема заявок и порядок зачисления задатка

Задаток в сумме 1 % от стоимости предмета торгов – 36 933,13 долларов США перечисляется по лоту в срок по 30.11.2023 на р/с BY78BPSB30121732950169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, код BPSBBY2X, получатель – ООО «ЛиквидБай», УНП 192290290, назначение платежа – задаток за участие в аукционе. Валюта платежа: белорусский рубль с применением курса Национального банка Республики Беларусь на дату внесения платежа. Задаток должен быть внесен до подачи заявки на участие в торгах.

Прием заявок с приложением документов осуществляется заказной корреспонденцией в адрес ООО «ЛиквидБай» (220079, г. Минск, а/я 256) либо по e-mail: info@likvid.by до 17.00 30.11.2023

Возмещение затрат	Победитель торгов (претендент на покупку) обязан возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, и вознаграждение Организатору аукциона по результатам аукциона в размере 0,3 % от окончательной цены продажи Объекта в течение 5 дней со дня проведения аукциона
Документы, необходимые для участия в торгах	Заявка на участие в торгах, платежный документ о перечислении задатка; документ, подтверждающий полномочия на участие в торгах

Извещение о ранее проведенных торгах было опубликовано в газете «Звязда» № 200 (30080) от 14.10.2023

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

Организатор аукциона/ оператор	ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом.1703, оф.46. www.ipmtorgi.by
Продавец	ООО «Производственно-коммерческая компания «РБК», г. Могилев, ул. Якубовского, д. 20а

Предмет электронных торгов

АДМИНИСТРАТИВНОЕ ЗДАНИЕ
(Здание административно-хозяйственное),
инвентарный номер 702/С-1053, общ. пл. 463,6 кв. м,
по адресу: Могилевская обл., г. Быхов, ул. Дорохова, 183.
Земельный участок общ. пл. 0,1464 га предоставлен продавцу для строительства и обслуживания административного здания на праве аренды по 11.09.2122 г.
Начальная цена, с НДС 20 % – 12 480,00 бел. руб.
Шаг торгов – 5 % от текущей цены

Задаток 10 % от начальной цены предмета электронных торгов перечисляется в белорусских рублях на счет BY92BELB3012004 8350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638

Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней со дня завершения электронных торгов

Срок оплаты предмета электронных торгов: 10 (десять) календарных дней после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов, установлен регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги» размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by

Победитель электронных торгов, либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **6 %** от цены продажи лота в течение 3 рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов, без объяснения причин снятия

Дата и время начала и окончания электронных торгов: 22.12.2023 г. с 11.00 до 13.00.
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

Дата и время окончания приема заявок: заявки на участие в электронных торгах принимаются по **21.12.2023 г.** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу www.ipmtorgi.by

Контактные данные	**Тел.: +375 17-373-21-33; +375 (44) 704-92-06. E-mail: info@ipmtorgi.by**

ЗАО «БелБанкротАукцион»,

организатор торгов по продаже имущества **ОДО «ФАРМИН»** (УНП 190073936), объявляет о проведении **01.12.2023 г. в 09.00** публичных торгов в электронной форме на электронной торговой площадке bankrottorg.by.

Перечень имущества и информация об условиях торгов размещены на сайте электронной торговой площадки: **bankrottorg.by**

ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению открытого акционерного общества «Сахарторг» (продавец) извещает о проведении 22 декабря 2023 года открытого аукциона по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. 2.9

№ лота	Наименование предметов торгов	Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20 %), бел. руб.	Сумма задатка, с учетом НДС (20 %), бел. руб.
	Условие продажи: срок начала использования приобретенного недвижимого имущества – не позднее девяти месяцев с даты заключения договора купли-продажи, в случае изменения целевого назначения – не позднее двадцати четырех месяцев с даты заключения договора купли-продажи. За неисполнение обязательств, предусмотренных договором купли- продажи, покупатель уплачивает штраф в размере 20 процентов от цены продажи недвижимого имущества. В течение одного года после уплаты либо поступления первого платежа в счет уплаты указанного штрафа покупатель устраняет допущенные нарушения. Неисполнение обязательных условий продажи по истечении одного года после уплаты либо поступления первого платежа в счет уплаты указанного штрафа, а также неуплата указанного штрафа являются основанием для расторжения договора купли-продажи по соглашению сторон либо по решению суда. При расторжении договора купли-продажи недвижимое имущество возвращается продавцу, в том числе с учетом выполненных покупателем неотделимых улучшений, без возмещения их стоимости, без возврата покупателю денежных средств, уплаченных им за недвижимое имущество		
1	Изолированное помещение с инвентарным номером 350/D-359032 площадью 448,3 кв. м, назначение – торговое помещение, наименование – продовольственный магазин, расположенное по адресу: Гомельская область, г. Гомель, ул. Белого В.А., 34-83. **Информация о земельном участке:** расположено на земельном участке с кадастровым номером **340100000007073237** общей площадью **0,1066 га (право пользования)**. **Местоположение (адрес):** Гомельская обл., г. Гомель, ул. Белого В.А., 34. **Целевое назначение земельного участка:** для строительства и обслуживания многоквартирного жилого дома и встроенно-пристроенного помещения	1 828 800,00	91 440,00

Продавец: Открытое акционерное общество «Сахарторг», 246010, г. Гомель, ул. Могилевская, 1а.

Порядок ознакомления с имуществом (осмотр) и заключение договора купли-продажи осуществляются по контактному тел. 8 (029) 139-13-77 Землянская Виктория Викторовна. Шаг аукционных торгов – 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона.

Для участия в аукционе необходимо:

1. Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца торгов** (открытое акционерное общество «Сахарторг»): р/с BY67BLBB30120400078372001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области, БИК BLBBBY2X, УНП 400078372, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № 1 (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления).

2. Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 21 ноября 2023 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00.

Прием заявлений для участия в аукционе **заканчивается 20 декабря 2023 г. в 16.00 включительно (предварительно по контактным телефонам Организатора торгов).** Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три календарных дня до его проведения.

Для участия в аукционе представляются: документ, подтверждающий внесение суммы задатка на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или индивидуального предпринимателя Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юридического лица, иностранного физического лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенная выписка из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор, или иные документы в соответствии с законодательством). В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Продавцом** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; произвести оплату за услуги (вознаграждение) по организации и проведению торгов в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола, а также возместить Продавцу затраты за публикацию в газете «Звязда» в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола; заключить договор купли-продажи в течение **30 (тридцати) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона, оплатить приобретаемое имущество, согласно срокам договора купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиала «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части).

Извещение о проведении аукциона размещено на сайтах: организатора аукциона – www.expert-usluga.by (раздел «Аукционы»); Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь www.gki.gov.by в разделе «Продажа/Аренда имущества», далее – «Продажа и аренда государственной недвижимости. Единая база». **Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальных сайтах Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы».**

Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора аукциона: 8 (0232) 23-23-56, 8 (044) 599-18-16.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ В ФОРМЕ КОНКУРСА ПО ПРЕДОСТАВЛЕНИЮ В АРЕНДУ ОХОТНИЧЬИХ УГОДИЙ ФОНДА ЗАПАСА

Бешенковичский районный исполнительный комитет Витебской области по поручению Витебского областного исполнительного комитета 22 декабря 2023 г. в 11.00 в здании Бешенковичского райисполкома, расположенного по адресу: г. п. Бешенковичи Витебской области, ул. Чуклая, 13 (малый зал), проводит торги в форме конкурса по предоставлению в аренду охотничьих угодий фонда запаса со сроком аренды 20 лет

Торги проводятся в порядке, определенном Положением о порядке проведения торгов по предоставлению в аренду охотничьих угодий, определения размеров платы за право заключения договора аренды и арендной платы за охотничьи угодья, утвержденном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 14 июня 2018 г. № 454.

На торги выставляются охотничьи угодья общей площадью 15,7 тыс. га, в том числе лесные охотничьи угодья 5,5 тыс. га, полевые охотничьи угодья 8,3 тыс. га, водно-болотные охотничьи угодья 1,9 тыс. га, в следующих границах:

северная: от устья реки Черногостницы в восточном, северном, северо-восточном и юго-восточном направлениях по середине реки Западная Двина до точки с координатами 55°09'53,5" СШ, 29°58'24,5" ВД;

восточная: от точки с координатами 55°09'53,5" СШ, 29°58'24,5" ВД в южном направлении по административной границе между Бешенковичским и Витебским районами до места пересечения с проселочной дорогой Клюши – Воеводки, далее в западном направлении по указанной дороге до деревни Клюши, далее в южном направлении по автомобильной дороге Н-2091 Подъезд к д. Жигалы от а/д М-3 Минск – Витебск до деревни Жигалы, далее в южном направлении по автомобильной дороге Н-2076 Подъезд к д. Застаринье от а/д М-3 Минск – Витебск до деревни Плиссы,

южная: от деревни Плиссы в западном направлении по автомобильной дороге Н-2027 Плиссы – Руда до деревни Руда, далее в северо-западном направлении по проселочной дороге до деревни Светогорцы, далее в юго-западном направлении по проселочной дороге до агрогородка Синицы, далее в западном направлении по автомобильной дороге Н-15008 Подъезд к аг. Синицы от а/д Н-2005 Задорожье – Забелье – Большие Павловичи до деревни Соржица;

западная: от деревни Соржица в северном и северо-западном направлениях по автомобильной дороге Н-2005 Задорожье – Забелье – Большие Павловичи до перекрестка с автомобильной дорогой М-3 Минск – Витебск, далее в восточном направлении по автомобильной дороге М-3 Минск – Витебск до места пересечения с рекой Черногостницей, далее вниз по течению указанной реки до ее устья.

К участию в торгах допускаются юридические лица, представившие в комиссию документы в установленные настоящим извещением сроки и объеме.

Размер ежегодной арендной платы за предоставляемые в аренду охотничьи угодья составляет 16,10 базовых величин или 595,70 (пятьсот девятьсот пять) белорусских рублей 70 копеек.

Условия конкурса по предоставлению в аренду охотничьих угодий фонда запаса:

1. Наличие у участника опыта, подтвержденного документально, ведения и организации охотничьего хозяйства не менее 20 лет.

2. Создание в течении одного года после заключения договора аренды и поддержание в соответствии с действующим законодательством на протяжении всего срока аренды не менее трех новых рабочих мест, за исключением штата егерской службы.

3. Обеспечение на протяжении всего срока аренды наличия штата егерской службы в соответствии с действующим законодательством, а также сотрудников с опытом кинологической работы не менее пяти лет.

4. Участие в выполнении доведенных показателей по развитию туризма в Бешенковичском районе, наличие у участника опыта, подтвержденного документально, в развитии и проведении иностранного охотничьего туризма.

5. Обеспечение на территории Бешенковичского района в течение пяти лет после заключения договора аренды охотничьих угодий строительства:

5.1. Комплекса для отдыха охотников, включающего:

не менее одного домика и обеспечивающего одновременное размещение не менее 10 человек с наличием не менее 10 спальных мест;

стоянку для автомобилей охотников;

вольеры для содержания охотничьих собак;

разделочную площадку с холодильной камерой;

благоустройство территории.

5.2. Стрелкового комплекса (тира для стрельбы на дистанции до одного километра включительно) с организацией обучающей, практической, спортивной стрельбы, проведением соревнований по стрельбе.

6. Обеспечение наличия или приобретения в течении одного года после заключения договора аренды охотничьих угодий автотранспортных, технических средств, моторных маломерных судов для осуществления биотехнических и охотохозяйственных мероприятий, а также охраны охотничьих угодий.

7. Обязательство по обустройству в охотничьих угодьях в течение одного года с момента заключения договора аренды охотничьих угодий:

благоустроенных стоянок (не менее 4-х, с обязательным наличием на них: навеса, стульев, костриц, хранилища для дров, туалета, места для сбора мусора) для охотников, места для разделки туш, в пределах охотничьих угодий;

подкормочных площадок для охотничьих животных, кормохранилищ в соответствии с требованиями Инструкции о порядке проведения биотехнических мероприятий, утвержденной постановлением Министерства лесного хозяйства от 16 мая 2014 г. № 8.

8. Обязательство по достижению оптимальной численности охотничьих животных нормированных видов в течение семи лет после заключения договора аренды охотничьих угодий и поддержание ее на этом уровне в течении всего срока действия договора аренды охотничьих угодий.

9. Обязательство по созданию в течении одного года после заключения договора аренды охотничьих угодий кинологической испытательной станции.

10. Предложения по осуществлению иных мероприятий, направленных на развитие охотничьего туризма, обустройства кварталов организованной охоты и ее безопасности, привлекательности охоты, с вложением в организацию и развитие охотничьего хозяйства инвестиций в объеме не менее 0,5 млн. белорусских рублей в течении трех лет с даты заключения договора аренды охотничьих угодий.

11. Предложения по защите населения, проживающего на территории охотничьих угодий, от неблагоприятного влияния выросшей популяции диких животных, оказанию содействия сельским исполнительным комитетам в решении данных вопросов, по предотвращению причинения вреда дикими животными сельскохозяйственным посевам и другому имуществу граждан, проживающих на территории охотничьих угодий, по возмещению причиненного им ущерба в связи с невыполнением пользователем охотничьих угодий своих обязательств по данному вопросу.

Для участия в конкурсе в срок до 17.00 18 декабря 2023 г. необходимо предоставить комиссии по организации и проведению торгов по адресу: Витебская область, г. п. Бешенковичи, ул. Чуклая, 13, приемная райисполкома либо кабинет 29 – секретарь комиссии, с 8.00 до 17.00 по рабочим дням, контактный номер телефона 8 02131 6 42 45 (приемная), 8 02131 640 87 (секретарь) следующие документы:

- заявление об участии в торгах и предоставлении охотничьих угодий в аренду по результатам торгов (далее – заявление) по форме согласно приложению 2 к Положению о порядке проведения торгов по предоставлению в аренду охотничьих угодий, определения размеров арендной платы за право заключения договора аренды и арендной платы за охотничьи угодья, утвержденному постановлением Совета Министров от 14 июня 2018 г. № 454;
- копию документа, подтверждающего полномочия руководителя участника торгов, либо доверенность представителя участника торгов и копия документа, подтверждающего его личность, в случае, если заявление подписывается не руководителем участника торгов;
- предложения в письменной форме о выполнении условий торгов, запечатанные в отдельном конверте с отметкой «Не вскрывать, для участия в торгах». При этом данные предложения являются конкурентными и не могут уточняться в ходе торгов;
- копия платежного поручения, квитанции или иного документа, подтверждающего внесение задатка.

Задаток вносится единовременно до подачи заявления на расчетный счет Бешенковичского райисполкома в размере 20 процентов (119 белорусских рублей 14 копеек) от суммы ежегодной арендной платы за предоставляемые в аренду охотничьи угодья фонда запаса.

Победителем торгов признается участник, все предложения которого соответствуют условиям конкурса. В случае если предложения двух и более участников торгов **по совокупности** соответствуют условиям конкурса, комиссия признает победителем торгов участника торгов по итогам голосования.

В случае поступления заявления при проведении торгов в форме конкурса от одного участника и соответствия его предложений условиям конкурса заключение договора аренды охотничьих угодий производится с этим участником на предложенных им условиях.

Участник, выигравший торги, в течение 5 рабочих дней со дня подписания протокола комиссии возмещает путем безналичного расчета на расчетный счет Бешенковичского райисполкома платежным поручением затраты на организацию и проведение торгов:

за изготовление и согласование биолого-экономического обоснования охотничьих угодий фонда запаса Бешенковичского района в размере 2200,00 (две тысячи двести) белорусских рублей;

за публикацию в средстве массовой информации извещения о проводимых торгах.

Окончательная сумма затрат и порядок их возмещения доводится до сведения участников торгов до начала их проведения в день проведения торгов.

Договор с победителем конкурса заключается Витебским областным исполнительным комитетом в сроки, установленные Правилами ведения охотничьего хозяйства и охоты, утвержденными Указом Президента Республики Беларусь от 21 марта 2018 г. № 112.

Платежные реквизиты для перечисления задатка, а также возмещения затрат на организацию и проведение торгов: расчетный счет IBAN BY32AKBB36043110030992200000 в ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Минск, BIC AKBBBY2X, получатель – Бешенковичский районный исполнительный комитет, УНП 300145203.

Адрес и контактный телефон секретаря комиссии: Витебская область, г. п. Бешенковичи, ул. Чуклая, 13, кабинет 29, рабочий день – с 8.00 до 17.00, контактный номер телефона 8 02131 640 87.

Комиссия по организации и проведению торгов

НА КОНКУРС АПАВЯДАННЯЎ

Празаік, журналіст, краязнаўца Анатоль Бензярук нарадзіўся на Берасцейшчыне. Жыве ў Жабінцы. Працуе ў Брэсцкай абласной газеце «Заря», шмат робіць для захавання гістарычнай памяці, гісторыка-культурнай спадчыны Жабінкаўскага раёна. Лаўрэат Брэсцкай абласной літаратурнай прэміі імя Уладзіміра Калесніка.

Асаблівая тэма для творцы — трагічныя выпрабаванні, якія спазнаў наш народ падчас Вялікай Айчыннай вайны. Тыя далёкія і страшныя падзеі азараюць сваімі трывожнымі водбліскамі сённяшняе мірнае жыццё. Пра гэта новае апавяданне Анатоля Бензерука. Па-майстэрску выбудаваны сюжэт (адзначым і ўласцівае аўтару тонкае пачуццё стылю) вядзе чытача ў аўдыторыю інстытута, дзе праходзіць экзамен па гісторыі. Не дужа добра падрыхтаваны студэнт, ад імя якога вядзецца аповед, у думках наракае на прыдзірлівага выкладчыка. Але раптам — быццам незнарок закранулі «нейкую патаемную струну» — адна дэталь паказвае нам звычайны экзамен з новага ракурсу...

Алена БРАВА.

Анатоль БЕНЗЯРУК

Экзамен па гісторыі

Была субота. Запомніце, гэта важна!

Церушыў снег. Было яшчэ цёмна — а восьмай гадзіне раніцы. Толькі стары ліхтар, падвешаны замест месяца, гойдаўся, стомлена рыпеў і кідаў сваё жоўтае святло на зямлю. І яно быццам разбівалася на кавалкі.

Мяне папярэджвалі хаваць горла і кутацца ў шалік. Прасілі трымаць між пальцаў старую сярэбраную манету — на шчасце. Але ж... субота, снег і гэты экзамен. Які па ліку ўжо? Здаецца, здаў больш іспытаў, чым пражыў гадоў на свеце. Аб чым хвалявацца?.. Толькі б не ўпасці — дрэнная студэнцкая прыкмета.

Перад самым інстытуцкім ганкам, там, дзе яшчэ ўчора хлюпала вада, сёння ўсё было вымашчана лёдам. Асцярожна, нязграбна перасоўваючы ногі, я рушыў па ім. Раптам не ўтрымаўся, і манетка — тая, што на шчасце! — выслізнула з далоні, ціхенькнула аб лёд і схавалася ў глыбокім снезе.

Ліхтар кінуў на мяне бледна-жоўты слуп святла, і побач нехта зайшоўся ад смеху. Толькі мне было ўжо не смешна: трымаючыся за выцятае месца, падняўся і ўвайшоў у будынак.

— Сёння Эдзік не ў настроі, — адразу прывітаў мяне сябар Сенька, угледзеўшы, што і мой настрой, як у рака перад лазняй.

— Не ў настроі? — хмыкнуў я.

Дзівак! Эдзік (афіцыйна — Эдвард Паўлавіч) і настрой, у маім разуменні, заўсёды былі рэчамі несумяшчальнымі. Лёд, аб які я пабіў бакі, відаць, цяплейшы за нашага Эдзіка-Эдварда!

На свет Эдвард Паўлавіч паглядаў строга і безапеляцыйна праз свае вялізныя рагавыя акуляры. Заўсёды чымсьці незадаволены, нейкі пахмурны, як восенская непагадзь, ён тварам сваім быў падобны на пабіты яблык, стары і зморшчаны. Пра яго ўзрост можна было толькі здагадвацца. Хутчэй за ўсё, Эдзік быў равеснікам Маркса і Энгельса, пра якіх так натхнёна чытаў лекцыі.

Мне толькі адноўчы пашчасціла даведацца, што Эдвард Паўлавіч умее смяяцца. Гэта здарылася, калі яго віншавалі са з'яўленнем новай кнігі. Партрэт Эдзіка тады вывесілі на дошцы аб'яў. Здарылася тым часам міма крочыць сапраўднай жывой легендзе гістарычнага факультэта, шаноўнай Юдзіфі Ісакаўне, пра якую гаварылі, што яна нарадзілася яшчэ тады, калі ўсё чалавецтва было непісьменным. Угледзеўшы знаёмы твар на сцяне, старая са шкадаваннем паківала галавою і прашамкала:

— Вось і Эдвард Паўлавіч памёр ужо...

Усе анямелі, потым нехта далікатна паспрабаваў удакладніць:

— Ды не, Юдзіфь Ісакаўна! Ён яшчэ ого-го які жывы! Нават кніжку зноў выдаў.

Але жанчына, не звяжаючы на чужыя словы, ціха ўздыхнула:

— А шкада. Такі добры чалавек быў... — і, быццам задаволеная тым, што яна самая старажытная на свеце, паціху пасунулася далей па справах.

Калі Эдварду Паўлавічу пераказалі гэтае здарэнне, ён аж заенчыў ад рогату. Смяяўся, і слёзы выступалі на яго вачах. А мне тады падалося, што ён больш плакаў, чым смяяўся.

* * *

— Марэк, сёння Эдзік проста звярэе, — паведаміў Сенька. — Шпурляецца залікоўкамі ва ўсе бакі. Ты шпаргалкі маеш?

— Ёсць нешта лепшае, чым шпоры, — я паказаў на падручнік. — Разумныя людзі напісалі, а не тыя, што шпаргалкі начамі строчаць.

— І што, спісваць збіраешся?

— Лёгка!

Сенька недаверліва засмяяўся і ўпэўнена заявіў:

— Вось Серафіма ледзь выйшла адтуль. А цябе вынесуць, далібог, з санітарамі вынесуць. І адразу ў рэанімацыю!

Спрачацца з ім не было часу. Тым больш што Серафіма ўжо выпіла шклянку вады і змучаным голасам запрасіла:

— Клікалі, каб наступны заходзіў.

Я быў наступны.

* * *

У аўдыторыі было ціха. Мабыць, як у пячоры.

Эдвард Паўлавіч глянуў на мяне без аніякай цікаўнасці і худым доўгім пальцам тыкнуў у стос білетаў.

— Цягніце... э-э-э, маладыча-ла-век, — выгаварыў ён, трохі расцягваючы словы.

Ягоны твар здаваўся стомленым і раздражнёным. Эдзік нервова пацёр нос і працягнуў, прыпадаючы на кожным складзе, як кульгавы конь на гасцінцы:

— Што гля-дзі-цё? Яны аднолькавыя... Калода не значаная.

Калі я выцягнуў білет, Эдзік праводзіў мяне на месца халодным пажаданнем «хутчэй рыхтавацца» і, здаецца, страціў да маёй асобы ўсялякую цікавасць, змежыў павекі, быццам задрамаў.

Час ішоў нетаропка. Пытанняў было два. Першае — лягчэй лёгкага. Толькі вось другое ніяк не вытанцоўвалася. Я пацягнуўся асцярожна да падручніка, які даўно перакачаваў з-за пазухі ў парту. Гартаў няспешна, асцярожна. Працаваў, як сапёр.

Раптам ува мне ўсё пахаладзела: нейкія паны-дабрадзеі, таварышы мае па няшчасці, паклалі ў парту цэлы стос шпаргалак. Паперкі сыпануліся мне пад ногі, разляцеліся па падлозе.

Эдвард Паўлавіч, які дагэтуль цешыўся, як кот на прыпечку, раптам ускочыў са свайго месца.

— Сюды, сюды ідзіце, — вельмі лагодна азваўся ён, але ў яго словах чуліся нядобрыя ноткі.

Апраўдвацца не было сэнсу. Я паслухмяна падняўся і пачаў свой шлях да выкладчыка.

— Ну-с, пачынайце... э-э-э... Слухаю, слухаю...

* * *

Я пачаў ціха, блытана, няўмела. Ён зусім не перапыняў, толькі грозна глядзеў скрозь свае вялізныя акуляры і цёр нос. Гаварыць рабілася ўсё цяжэй. Язык біўся ў перасохлым роце, як адарваны, у галаве чуўся нейкі гул. Я правальваўся ў бездань, а яго шэрыя вочкі-драпежнікі пільна, бязлітасна сачылі за мной.

— Так-так, — нарэшце насмешліва перарваў прафесар маю блытаніну, невыразна матнуў галавой і зноў дадаў: — Так!

Ён падышоў да акна. Стаяў, глядзеў, як сыпле снег, нешта слухаў, да нечага прыслухоўваўся, але не да мяне.

І падалося: ён забыўся пра маю прысутнасць. І раптам агарнуў такі жаль да сябе самога, што я адважыўся перарваць яго думкі. Мне ж так патрэбна добрая адзнака. Усё, што заўгодна, але толькі не «тры». Бо «тройка», гэтая птушка-«тройка», азначае адзінае: няма табе, браце-студэнце, стыпендыі! Хоць жыві, хоць пабірайся! Але ж гэтак біць па кішэні? Па кішэні, у якой і так ніц не звініць, нават апошні грош збег у снег!

Я зашамацеў паперкаю, каб звярнуць увагу, і заспяваў, як анёльчык, старую студэнцкую малітву:

— Не псуйце залікоўку «тройкай»! Пастаўце «двойку»... Ы-ы! Прыйду, калі скажаце... здам... вывучу. Не буду спаць, есці... не буду.

Ён нават не глянуў у мой бок. Яму цікавей быў снег за вокнамі, чым мае енкі і просьбы. Ён жорстка, спінаю адгукнуўся:

— Вы, што, здурнелі, малады чалавек?.. Я ўжо сто гадоў не стаўлю «двоек». Ідзіце, ідзіце...

Я павольна пачаў адступаць да дзвярэй. Вусны мае дрыжалі, і перад вачыма паўстала нейкая шэрая заслона.

— Пастаўце «два»... Я прыйду... У панядзелак. Прыйду, пераздам...

Ён уздрыгнуў: штосьці адбылося з Эдзікам. Быццам незнарок я закрануў нейкую патаемную струну. Яго спіна раптам напружылася, нервова перакрывіліся плечы, скалануліся, як пластрэленыя. Рэзка, адразу ўсім тулавам Эдзік павярнуўся да мяне. У яго вачах з'явіліся дзве шалёныя бліскавіцы, што загарэліся гневам і адчаем. Незвычайна спакойна, ціха ён вымавіў, хаваючы гэтыя свае палаючыя вочы:

— Што вы кажаце? У які панядзелак?

— У панядзелак — пасля нядзелі...

— Глупства! Вар'яцтва! — Эдвард Паўлавіч грымнуў кулаком па падаконніку.

Ён ужо крычаў, не стрымліваўся, уся яго істота бушавала, як жарало вулкана. Ён схапіў з нейкім нечалавечым азартам маю залікоўку, размашыста крэмзаў яе, быццам змагаўся з драпежным зверам. І перамог нарэшце, кінуў на стол.

Рукі мае калаціліся. Я ледзь адгарнуў патрэбную старонку. Яго каравы раз'юшаны подпіс распоўзся ажно на тры радкі. А побач з ім стаяла адзнака «добра»... «Доб-ра»?!

Я падаўся да дзвярэй і ў хваляванні, што агарнула мяне, няўпэўнена і сумленна прамармытаў:

— Але ж я... не адказваў на «добра»...

Ён глянуў на мяне, быццам угледзеў упершыню, і адным горлам прасіпеў:

— Быў у мяне ўжо адзін такі прайдзісвет. Казаў, бажыўся, кляўся: не стаўце, не стаўце, у панядзелак прыйду — пе-раз-дам. Паслухаўся яго... А ў нядзелю было 22 чэрвеня...

— Вайна? — ледзь вымавіў я.

Ён увесь неяк сабраўся, паменшыўся, жаўлакі ягоныя зайгралі, давячы слязу.

— Ён — той... загінуў?

Стары прысеў, стомлена сабраў свае кашчавыя пальцы ў кулакі і ціха кінуў, як пруцік у агонь:

— Загінуў — не загінуў... — падняўся, распраўві заўсёды гарбатую спіну, быццам вызваліў крылы, здавён прыхаваныя, і закончыў:

— Чорт вас ведае! Вось так: укоціш «лебедзя», а потым — чакай яшчэ сорак гадоў: прыйдзеш пераздаваць ці не?

...Я выйшаў на вуліцу. Снег усё ішоў, і не было яму канца. У пакоі гарэла святло. Эдвард Паўлавіч стаяў у перакрыжаванні акна і глядзеў на гэты снег. А можа, далей і глыбей?..

«КУПАЛА — ГЭТА БЕЛАРУСЬ...»

Даследчыкі творчасці класіка беларускай літаратуры сабраліся ў Гродна на традыцыйных Купалаўскіх чытаннях

Навуковая канферэнцыя адбылася ў сценах Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы. Дарэчы, мерапрыемства праходзіць тут у 14-ы раз і з'яўляецца брэндавым для ВНУ. Тэматыка і сёлета атрымалася даволі шырокай — як падчас пленарнага пасяджэння, так і ў рабоце секцый. Размова ішла аб захаванні спадчыны вялікага паэта, яго сувязі з сучаснасцю, уплыве паэта на нацыянальнае адраджэнне і сусветную літаратуру. Феномен Купалы адзначылі і замежныя ўдзельнікі канферэнцыі, у прыватнасці навукоўцы з Кітая і Узбекістана.

Традыцыйна Купалаўскія чытанні пачаліся песняй «Мая малітва» на вершы паэта, якую выканаў студэнт ГрДУ Іван Вайтовіч. Дарэчы, музыку да гэтага верша Янкі Купалы напісаў у 1990-я гады кампазітар Алег Моўчан, а выканаў песню Уладзімір Мулявін. Трэба сказаць, што спявак нярэдка казаў у сваіх інтэрв'ю, што менавіта Купала стаў яго любімым паэтам і дапамог адкрыць Беларусь. Таму і песень на яго вершы, створаных ансамблем «Песняры», больш за тры дзясяткі.

З сярэдзіны 90-х гадоў, дарэчы, пачаўся адлік і Купалаўскіх чытанняў у Гродне. Арганізатары адзначылі, што многія навукоўцы, што называецца, выраслі на іх. Грунтоўныя даклады, як правіла, складаюцца ў зборнікі, якімі выкладчыкі карыстаюцца ў сваёй рабоце са студэнтамі. Як паведаміла старшыня Гродзенскага аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі Людміла КЕБІЧ, канферэнцыя ахоплівае шырокі спектр пытанняў. Матэрыялы па ёй выдаюцца яшчэ і асобным зборнікам «Літаратурнае краязнаўства». Але не толькі. Напрыклад, гродзенскія пісьменнікі сваё ўспрыманне Янкі Купалы і класікаў беларускай літаратуры адлюстравалі ў творах розных жанраў, якія выйшлі летась асобным зборнікам і прысвечаны 140-годдзю з дня нараджэння паэта. На думку Людмілы Кебіч, Янка Купала аб'ядноўвае, згуртоўвае думаючых людзей розных пакаленняў. А яго творчасць — гэта тая зорка, якая асвятляе правільны літаратурны кірунак беларускіх пісьменнікаў.

Задача канферэнцыі, па словах арганізатараў, знайсці новыя штрыхі ў жыцці і творчасці Купалы, акрэсліць тыя моманты ў дзейнасці беларускага класіка, якія раскрываюць яго як асобу і набліжаюць яго творчасць да сучасных рэалій.

У канферэнцыі прыняло ўдзел каля 50 даследчыкаў творчасці Купалы. Значны ўнёсак у работу Купалаўскіх чытанняў зрабіў Саюз пісьменнікаў Беларусі. Сваю думку выказаў доктар філалагічных навук, загадчык цэнтра філасофіі, літаратуры і эстэтыкі Інстытута філасофіі НАН Беларусі Валерый МАКСІМОВІЧ. Ён лічыць, што кожны форум дазваляе наблізіцца да асобы беларускага песняра, у даследаваннях жыцця і творчасці якога яшчэ не пастаўлена апошняя кропка.

Між тым Купалаўскія чытанні даўно перасягнулі межы краіны і, дзякуючы камунікацыйным тэхналогіям, набылі міжнародны размах. Як зазначыла рэктар ГрДУ імя Я. Купалы Ірына КІТУРКА, сёлета сярод удзельнікаў можна ўбачыць прадстаўнікоў Таджыкістана, КНР, Казахстана, Узбекістана, Расіі. Усе яны выказалі свае погляды на творчасць беларускага паэта.

Напрыклад, прафесар кітайскага ўніверсітэта Гу ЮЙ паведаміў, што захапіўся перакладам вершаў Купалы з-за таго, што яны яго чапляюць «за жывое». Асабліва верш «А хто там ідзе?». Яго, дарэчы, перакладалі ў Кітаі неаднойчы. Прафесар лічыць, што гэты верш дапамог яму лепш зразумець беларусаў, іх права на годнае жыццё. Ён яшчэ раз прыгадаў словы Максіма Горкага, які назваў гэты верш гімнам беларусаў, суровай і красамоўнай песняй.

Каб раскрыць асобу класіка, кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры беларускай філалогіі ГрДУ імя Я. Купалы Аліна САБУЦЬ нагадала місію літаратуры, якая прызвана перастроіць чалавека разумнага ў чалавека гуманнага. «Умець заставацца чалавекам у самых складаных умовах — гэта для Купалы было важна», — падкрэсліла Аліна Сабуць.

Асоба паэта, на яе думку, асабліва поўна раскрываецца ў эпісталярных мемуарах, якія не так даўно выйшлі з друку, у тым ліку ў Выдавецкім доме «Звязда». Гэта нарыс «Сустрэчы. Янка Купала» Льва Клейнбарта — аднаго з першых бібліёграфаў і даследчыкаў творчасці паэта. Дарэчы, пераклад на беларускую мову ажыццявіў старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі, дырэктар – галоўны рэдактар Выдавецкага дома «Звязда» Аляксандр Карлюкевіч.

Аліна Сабуць падчас канферэнцыі звярнула ўвагу на гэты салідны том невыпадкова. У выданні псіхалагічны партрэт паэта падаецца праз успаміны і дыялогі, суб'ектыўныя аўтарскія адступленні і ўражанні. Тэкст мяжуецца з ліставаннем, дзе раскрываюцца постаць паэта, яго пачуцці і эмоцыі ў перыяд з 1910 года па 1929-ы.

— Як можна даведацца з выдання, крыніцай сваёй творчасці Купала называе беларускія народныя казкі. Так пісаў ён Клейнбарту. Народная творчасць, піша Купала, была першым настаўнікам, хутчэй натхняльнікам, абуджала творчую фантазію. А культ кнігі быў пачаткам пачаткаў, жыццёвай крыніцай натхнення, пазнання свету і сябе ў гэтым свеце, — акрэсліла важныя моманты творчасці Купалы Аліна Сабуць.

Таксама яна звярнула ўвагу наераймальнасць пакаленняў у даследаванні творчасці паэта з боку сённяшніх студэнтаў-купалаўцаў. Магчыма, гэта абумоўлена і ўдзелам у такіх канферэнцыях, тым не менш свае асабістыя адносіны да паэта яны выказалі ў даволі важкім зборніку «Песнярам Айчыны», які летась выйшаў у гродзенскім выдавецтве і прысвечаны 140-годдзю беларускіх класікаў — Купалы і Коласа. Студэнты не толькі выказалі свае ўражанні, але нават прысвяцілі вершы беларускім класікам. У 2022 годзе выйшла ў свет яшчэ адно ўнікальнае выданне — энцыклапедыя «Янка Купала». Такім чынам, працягваецца папулярызацыя не толькі творчасці паэта, але і яго асобы.

Вяртанне да Купалы, лічаць навукоўцы, важна яшчэ і з пункту гледжання беларускай мовы, якую сфарміравала класічная літаратура на пачатку мінулага стагоддзя. На гэты конт таксама вядзецца нямала даследаванняў. Навукоўцы называюць тры складальнікі купалаўскай папулярнасці — ён пісаў для беларусаў, пісаў на роднай мове і пісаў проста.

На думку дырэктара навуковай бібліятэкі ГрДУ імя Я. Купалы, магістра філалагічных навук Мікалая ГРЫНЬКО, кожныя такія чытанні — гэта адкрыццё чагосьці новага, у тым ліку ў асабістым эмацыянальным плане.

— Купала сучасны заўсёды — ад першага зборніка «Жалейка» 1908 года да апошніх яго твораў. Гэта класіка, дзе ты бачыш пытанні, бачыш думкі, праблемы і іх вырашэнне. Беларусы зацікаўлены ў Купале. Што мы хочам? «Людзьмі звацца» — ёміста адказвае на гэта пытанне Купала. Гэта актуальна, бо мы павінны паказаць усяму свету, што мы не горшыя. А так і ёсць. І толькі наша сціпласць не дае паказаць нам магутнасць беларуса. А на самай справе мы і там лепшыя, і там не горшыя, і там не апошнія, — упэўнены Мікалай Грынько.

Навуковец прыгадвае радок верша «Спадчына»: «Завецца спадчына мая ўсяго старонкай родною». На думку Мікалая Грынько, такі пасыл сёння асабліва актуальны. Гэтыя радкі даюць магчымасць зразумець, што мы жывём у Беларусі і для Беларусі. «Купала — гэта Беларусь, і наша задача — зразумець сябе як чалавека, як грамадзяніна сваёй краіны»,— лічыць удзельнік канферэнцыі.

Маргарыта УШКЕВІЧ,
фота аўтара.

Памяць

ВІЦЕБСКІ ЎКЛАД У ГЕРАІЧНАЕ МІНУЛАЕ

У горадзе на Дзвіне збіраюць савецкія манеты, якія напярэдадні 9 Мая 2025 года з'явяцца на Паклоннай гары ў Маскве ў выглядзе бронзавага манумента.

Акцыя «Жывая памяць удзячных пакаленняў» праходзіць у рамках праекта «Дзеці Беларусі — ветэранам і будучым пакаленням», што рэалізоўваецца дабрачынным фондам імя Аляксея Талая. У рамках акцыі кожны ахвотны можа апусціць савецкія манеты ў колбу. Потым яны будуць пераплаўлены ў бронзавы народны помнік. Два падобныя памятныя знакі ўжо гатовы: адзін размясціўся на набярэжнай у парку Перамогі ў Мінску, другі ў наступным годзе будзе ўсталяваны каля сцен Брэсцкай крэпасці.

Памятны знак у выглядзе трохкутнага пісьма ваенных гадоў і дрэва, якое стаіць побач, — памяць аб гераічным часе, а таксама пакаленні спадчыннікаў Перамогі, якія

выраслі ў мірныя гады. Па задумцы аўтараў праекта, манумент для многіх людзей стане сямейнай каштоўнасцю, аб'яднае і ўмацуе сувязь пакаленняў.

У пачатку кастрычніка колба для збору манет з'явілася ў Віцебскім мастацкім музеі. На адкрыцці дабрачыннай акцыі першыя манеты ў яе апусцілі кіраўніцтва вобласці, прадстаўнікі Рассупрацоўніцтва, Каардынацыйнага савета расійскіх суайчыннікаў пры Пасольстве Расіі ў Беларусі, Віцебскага грамадскага аб'яднання «Рускі дом», Крыла прадпрымальнікаў ГА «Беларускі саюз жанчын», абласнога аддзялення ГА «Саюз пісьменнікаў Беларусі», ветэраны і школьнікі.

«Ганаруся тым, што для трэцяга помніка мы адкрываем збор і тую самую колбу, куды грамадзяне змогуць апусціць манетку ад сваёй сям'і, менавіта ў Віцебску, маім родным рэгіёне. Мы прагаварылі гэтую магчымасць з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Расійскай Федэрацыі Барысам Грызловым. Ён, даведаўшыся, наколькі грандыёзныя сацыяльна значныя праекты рэалізоўваюцца на прасторы Саюзнай дзяржавы (цяпер пакуль на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь),

выказаў словы падтрымкі і поўнай гатоўнасці ажыццявіць таксама маштабна гэты праект і ў Расійскай Федэрацыі. ...Гэта будзе знак для ўсяго свету, што мы разам: і нашы лідары, і народ, і нашы ўнутраныя пасылы, і нашы справы», — адзначыў заснавальнік дабрачыннага фонду, грамадскі дзеяч Аляксей Талай.

Збор манет разам са спонсарскай дапамогай актыўна працягваецца. На мінулым тыдні да дабрачыннай акцыі далучыліся прадстаўнік дабрачыннага фонду Аляксея Талая па горадзе Віцебску і Віцебскай вобласці, кіраўнікі і члены гарадской і абласной арганізацыі Беларускага саюза афіцэраў, грамадскага аб'яднання «Беларускі саюз ветэранаў вайны ў Афганістане», грамадскага аб'яднання «Беларускі саюз ваенных маракоў», Ліберальна-дэмакратычнай партыі, Віцебскай гарадской арганізацыі ветэранаў, навучэнцы і педагогі віцебскіх школ № 5 і № 8, студэнты Віцебскага дзяржаўнага ордэна Дружбы народаў медыцынскага ўніверсітэта, якія з'яўляюцца членамі патрыятычнага клуба «Служу Айчыне».

Манеты ў аналагічныя колбы ўжо апусцілі і перадалі жыхары многіх гарадоў. У іх ліку з Масквы, Санкт-Пецярбурга, Смаленска, Пскова, Вялікіх Лук, Электрасталі, Курска, Казані і іншыя. Колба ў Віцебску прабудзе да вясны 2025 года, таму кожны зможа ўнесці свой уклад у агульную справу дзеля гераічнай памяці. Валанцёры плануюць устанавіць падобныя колбы ў іншых беларускіх гарадах.

Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.
Фота БелТА.

«ЛАКАНІЧНА, ЯК АФАРЫЗМ, І ПА-МАСТАЦКУ СЦІСЛА, ЯК САНЕТ»

Штрыхі да партрэта Івана Замоціна

У Беларускім дзяржаўным архіве літаратуры і мастацтва ёсць цэлая папка газетных выразак пра святкаванні юбілеяў Максіма Багдановіча і іншыя звязаныя з паэтам падзеі. Ужо 21 красавіка 1923 года ў газеце «Савецкая Беларусь» надрукавалі зацемку «Беларуская культура. Знайдзеныя скарбы!» пра тое, што бацька паэта, Адам Рыгоравіч, выратаваў з пажару і збіраецца перадаць на Беларусь архіў свайго сына. А 25 мая 1927 года нумар той жа «Савецкай Беларусі» быў прысвечаны 10-годдзю з дня смерці Максіма.

«І ўсё прамільгнула хутка, на працягу некалькіх гадоў жыцця, амаль мімалётна, — часта лаканічна, як афарызм, і заўсёды па-мастацку сціслa, як санет. І ўсё гэта ўспыхнула ў парадку яскравага росквіту, які перарваўся ранняй смерцю, — у парадку амаль метэорнага бляску, што згас у прымушаным патуханні».

Так апісваўся творчы шлях Максіма Багдановіча ў вялікім артыкуле, пад якім стаяў сціплы подпіс: «Замоцін». За сціплым подпісам — яркая, знакавая для беларускай культуры асоба.

СЯЛЯНСКІ СЫН

Гэтая постаць у многім звязаная для нас з імем Максіма Багдановіча. Менавіта Іван Замоцін узначаліў Літаратурную камісію Інстытута беларускай культуры па падрыхтоўцы і выданні першага збору твораў Максіма Багдановіча і вёў перамовы з бацькам паэта. Менавіта Іван Замоцін папулярызаваў творчасць Багдановіча і пераканаўча акрэсліў яе месца ў нашай культуры. Заснавальнік беларускай тэксталогіі, знаўца беларускай літаратуры... А між тым ён не беларус і нарадзіўся 150 гадоў таму ў сялянскай сям'і ў вёсцы Крывуліна Бежацкага павета Цвярской губерні.

Прабіцца «ў людзі» таленавітаму хлопцу было надзвычай цяжка. У гэтым у яго шмат агульнага з бацькам Максіма Багдановіча Адамам Рыгоравічам — той таксама з сялянскага саслоўя, з прыгонных. Ужо скончыўшы на казённы кошт Пскоўскую гімназію, а потым гісторыка-філалагічны Пецярбургскі інстытут, сцвердзіўшы сябе як бліскучы малады навуковец, Іван Замоцін быў вымушаны паехаць у родную вёску і «прастаўляцца» чальцам сялянскай абшчыны, да якой афіцыйна належаў, каб атрымаць іх дазвол на «адкрапленне».

Напэўна, знаходзіліся аднавяскоўцы, каму карцела паздзеквацца з вучонага суседа, маўляў, а хто ты такі, занадта разумны, не дамо табе адкраплення, працуй з намі на полі, гной варочай...

У 1922-м годзе Іван Замоцін прыняў прапанову Народнага камісарыята асветы БССР стаць прафесарам Беларускага ўніверсітэта. Наш нацыянальны ўніверсітэт толькі ствараўся, быў агромністы дэфіцыт кадраў. І пакуль тыя нацыянальныя кадры падгадуюцца, запрасілі адусюль прадстаўнікоў акадэмічнай навукі, вядомых навукоўцаў «з былых». Уладзіміра Пічэту, Аляксандра Вазнясенскага, Івана Замоціна.

ВУЧОБА НА ВІЛЕНСКІМ РЫНКУ

Вядомы архівіст і гісторык Віталь Скалабан, з якім шмат гадоў таму мы рабілі матэрыял пра Івана Замоціна, горка жартаваў: Замоцін, напэўна, адзіны, хто быў у часы рэпрэсій асуджаны адначасова як «расійскі шавініст» і «беларускі нацыяналіст», хаця не быў ні тым, ні іншым. А яшчэ на мемарыяльнай дошцы ў гонар Замоціна на будынку педуніверсітэта Максіма Танка мы заўважылі памылкі — на дошцы ў памяць самага найпунктуальнага вучонага-тэкстолага значылася, што ён акадэмік АН СССР, хаця насамрэч — член-карэспандэнт, і

што ён член-карэспандэнт АН БССР, насамрэч жа — акадэмік.

На погляд звычайнага чалавека, не такія ўжо важныя памылкі, але Замоцін такое б не прапусціў.

Ён, калі прыехаў працаваць на Беларусь, з усім палам даследчыка і шчырасцю чалавека, што хоча служыць народу, які яго паклікаў, узяўся за вывучэнне беларускай мовы. Хадзіў на Віленскі рынак у Мінску, — гэта непадалёк ад вакзала і сучаснай плошчы Незалежнасці, там жа Замоцін атрымаў і кватэру. Услухоўваўся ў жывую гаворку людзей, засвойваў словы, інтанацыю. Ужо праз год Замоцін напісаў артыкул на беларускай мове пра паэму Якуба Коласа «Новая зямля». Паэт Язэп Пушча гаварыў, як лёгка працуецца з Іванам Замоціным, які па сваім укладанні ў беларускую культуру варты дзесяці беларусаў.

Не толькі з Максімам Багдановічам звязаны ўнёсак Замоціна. У тым жа БДАМЛІМ бачым выразку з газеты «Новае жыццё» ад 18 мая 1923 года — гэтая беларуская газета выходзіла ў Вільні ўсяго некалькі месяцаў, што не дзіўна, бо пісала пра ўціск беларусаў польскімі ўладамі і пра цікавыя падзеі ў Савецкай Беларусі. Сярод іншага ў нумары друкуецца заметка пра пятнаццацігадовы юбілей літаратурнай працы Уладзіслава Галубка, які святкавалі ў Мінску ў Цэнтральным Доме Працаўнікоў, у зале, поўнай публікі. На вечарыне *«Праф. Замоцін адзначыў, што крытыка часта вельмі незаслужана нападала на творы Галубка, але ўсё ж такі адзначала іх сцэнічнасць. Усе творы Галубка мала падходзяць пад мерку літаратурных, але затое адзначаюцца сваёй сцэнічнасцю. А гэта вельмі важна для пастановак на вясковых сцэнах»*.

Думаецца, вельмі важным было такое заступніцтва з боку акадэмічнага вучонага для Уладзіслава Галубка.

Яшчэ адзін дакумент, які тычыцца Замоціна, знаходзім у БДАМЛІ-Маўскім фондзе Вацлава Ластоўскага. Гэта ліст ад 18 студзеня 1927 года грамадзяніну Ластоўскаму (правапіс арыгінала):

«Літаратурная камісія Інстытуту Беларускае Культуры ў сучасны момант падрыхтоўвае да акадэмічнага выданьня творы Цёткі (Элёізы Пашкевіч-Кейрыс).

Да гэтага часу Камісіі ўдалося сабраць творы і наогул матар'ялы аб жыцьці і творчасьці пакойнай паэтэсы ўсяго тыя, якія можна было адшукаць у Менску, — але-ж гэтыя матар'ялы далёка няпоўныя. Вось чаму Камісія зварочваецца да Вас з просьбай пераслаць ёй літаратурныя творы і ўсе іншыя матар'ялы поэтэсы і аб поэтэсе, якія, можа, захаваліся ў Вас, ці ў Вашых знаёмых, ці ў якіх-небудзь архівах.

Пры гэтым Камісія дадае невялічкі сьпіс пытаньняў, на якія пажадана атрымаць адказ, а таксама і сьпіс твораў, якія ўжо Камісія сабрала.

З павагай, старшыня Літаратурнай камісіі проф. І. Замоцін. Сэкратар Я. Плашчынскі.»

Нагадаю, што Язэп Плашчынскі — гэта і ёсць паэт Язэп Пушча, які так высока адзываўся пра супрацу з Замоціным.

«ОБЕЗВРЕДИТЬ ЭТИХ ГНИЛЫХ КРИКУНОВ»

У папцы з архіва адшукваем яшчэ адну газетную выразку, на гэты раз з «Литературной газеты», ад 20 чэрвеня 1949 года (на выразцы памылкова пазначаны 1940-ы), там згадваецца пра II з'езд савецкіх пісьменнікаў БССР. У артыкуле пад назвай «Дело чести белорусских писателей» тых пісьменнікаў папракаюць, што мала пішуць пра стваральную працу, індустрыяльную перабудову, наватараў сельскай гаспадаркі. Але ёсць і прычыны. *«Долгое время в литературной и театральной критике Белоруссии орудовала кучка буржуазных космополитов, принижавших национальную гордость белорусского народа, оплевывавших творческое наследие писателей-демократов Богушевича, Богдановича, бессмертного Янки Купалы, встречавших в штыки каждое новое произведение, проникнутое духом советского патриотизма. Партия помогла разоблачить и обезвредить этих гнилых крикунов»*.

Сумнае ўражанне пакідае падобная рыторыка, калі ведаць, што пад «гнілымі крыкунамі» маюцца на ўвазе бліскучыя літаратары, беларускія патрыёты, «маладнякоўцы», «узвышэнцы», тыя, хто сапраўды папулярызаваў творчасць беларускіх класікаў і бараніў іх ад «аглабельнай крытыкі»... Сярод тых, ад каго пазбавіліся, быў і Іван Замоцін. Прафесара першы раз арыштавалі ў 1934-м годзе. Тады адпусцілі... А 17 жніўня 1937-га ў газеце «Звязда» з'яўляецца артыкул «Пра акадэміка Замоціна і яго прыхільнікаў», дзе даводзіцца, што Замоцін — манархіст, які праводзіць імперыялістычную палітыку, адначасова з'яўляецца «правадніком буржуазных, нацдэмаўскіх, трацкісцка-рапаўскіх установак у літаратуразнаўстве». 4 красавіка 1938 года Івана Замоціна зноў арыштавалі. Следства працягвалася больш за год. Акадэмік быў асуджаны на восем гадоў лагераў. Сярод тых, хто спрабаваў яго выратаваць, быў Якуб Колас, з якім звязвала сяброўства.

У афіцыйнай даведцы, якую атрымала сям'я, гаворыцца, што Замоцін памёр 25 мая 1942 года ў бальніцы лагера ў Комі АССР «ад сардэчнага прыступу». Што хаваецца пад гэтай фармулёўкай, дзе магіла — невядома.

